РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2025 г. СУБОТА № 62 (30450)



## «НІЯКАЙ ЗАЛАТОЙ СЯРЭДЗІНЫ БЫЦЬ НЕ МОЖА. ЁСЦЬ ЗАКОН — ЯГО ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ»

**Праект указа аб кантрольна-наглядной дзейнасці абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці**

(Працяг на 2–3 стар.)

# НЕЙРАСЕТКА Ў ДАПАМОГУ

**Як супрацоўнічаюць айчынныя навука і медыцына?**

Для аказання медыцынскай дапамогі шырока выкарыстоўваюцца магчымасці інфармацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту. У прыватнасці, яны могуць спрагназаваць рызыкі развіцця таго ці іншага захворвання ў чалавека. Акрамя таго, спецыяльныя комплексы прагназуюць аддаленыя наступствы для здароўя ў дзяцей, якія лечацца ад злаякасных захворванняў. А нейрасетка, напрыклад, ужо сёння дапамагае ў распазнаванні хвароб лёгкіх на ранніх стадыях ці цукровага дыябету. Расказваем, як беларускія вучоныя дапамагаюць айчыннай медыцыне асвойваць новыя метады лячэння, ствараць і прымяняць новыя лекі.



СТАР. 8–9



У БЕЛАРУСЬ! ПА ЯКАСНЫЯ ПРАДУКТЫ, УРАЖАННІ І ЗДАРОЎЕ 7

# ШТО ЗМЯНЯЕЦЦА З 1 КРАСАВІКА?

У красавіку ў Беларусі вырасце базавая арэндная велічыня, ва ўсіх мабільных аператараў з'явіцца базавы сацыяльны тарыф, адкрываюцца новыя авіярэйсы з абласных цэнтраў, нас чакаюць суботнік і вялікія выхадныя.




СТАР. 8–9

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

# «НІЯКАЙ ЗАЛАТОЙ СЯРЭДЗІНЫ ЁСЦЬ ЗАКОН —

## Праект указа аб кантрольна-наглядная дзейнасці

На ўзроўні Прэзідэнта разгледзелі ўдасканаленне кантрольнай дзейнасці. Адпаведную нараду Аляксандр Лукашэнка правёў з удзелам членаў урада, губернатараў і кіраўнікоў кантрольных органаў. Пытанні кантрольна-наглядная дзейнасці ўжо разглядаліся на спецыяльнай нарадзе ў кіраўніка дзяржавы ў маі мінулага года. Тады было вырашана перагледзець заканадаўства, падрыхтаваць асобны адзіны дакумент па гэтых пытаннях і ўнесці яго на разгляд Прэзідэнту. Дапрацаваны праект указа і разглядалі ўчора на нарадзе.



### НА ЧЫМ НАСТОЙВАЕ ПРЭЗІДЭНТ?

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з гэтым дакументам і выказаў свае ацэнкі. Згодна з праектам указа, кантрольныя органы павінны працаваць на апярэджанне. Калі ёсць тыповыя парушэнні, уласцівыя многім суб'ектам гаспадарання, мяркуецца ва ўзаемадзеянні з міністэрствамі і выканкамамі загадзя даводзіць гэту інфармацыю да прадпрыемстваў. «Гэта значыць, абагульняць парушэнні і даводзіць да прадпрыемстваў. Але, я так мяркую, вы таямніцы не робіце па выніках праверак?» — удакладніў Прэзідэнт. Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў адзначыў, што ніякай таямніцы ніхто не робіць, ёсць адпаведныя рэсурсы, дзе можна атрымаць інфармацыю аб парушэннях.

«А як гэта: загадзя даводзіць інфармацыю? Гэта як у нас было на выбарах: выбары яшчэ не адбыліся, а хтосьці ў Еўрасаюзе прызнаў іх несапраўднымі», — іранічна заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

**Згодна з праектам указа, мяркуецца выключыць залішняе ўмяшанне ў дзейнасць прадпрыемстваў, якія працуюць нармальна, і дапамагчы ім не допускаць парушэнняў. «А як гэта: залішняе ўмяшанне, як гэта разумець? Што гэта за норма такая? Прадпрыемстваў, якія працуюць нармальна, — гэта як? Якія з прыбыткам, якія зарплату нармальна плацяць — гэта нармальна працуе прадпрыемства? Яны што, парушэнняў не дапускаюць? Ці мы ім нейкі асобны рэжым уводзім? Хацелася б пачуць», — удакладніў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што праект указа, падрыхтаваны ўрадам, варта разглядаць, прымаючы да ўвагі меркаванне Камітэта дзяржкантролю. «Галоўнае, якія наступствы будуць ад гэтага дакумента», — адзначыў ён.

Прэзідэнт удакладніў, ці няма перабору з праверкамі бізнесу. Васіль Герасімаў запэўніў, што ўсё ў норме. «Ну вось, бачыце, ён кажа, што няма нічога ненармальнага. Прапаноўваюць залатую сярэдзіну. Катэгарычна супраць.

**Ніякай змовы і ніякай залатой сярэдзіны быць не можа. Ёсць закон — яго трэба выконваць. У законе ўсё прапісана: гэта парушыў — столькі атрымаў, гэта парушыў — яшчэ столькі атрымаў, — заявіў кіраўнік дзяржавы.**

— Я хацеў бы пачуць меркаванні, галоўнае, аўтараў, што яны маюць на ўвазе пад некаторымі нормамі гэтага ўказа. Калі вы хочаце такім чынам выпусташыць сутнасць і прынізіць ролю Прэзідэнта ў гэтым плане, не атрымаецца».

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на тэзіс аб тым, што кантрольныя органы павінны займацца прафілактыкай парушэнняў. Ён папрасіў ахарактарызаваць гэта «ад зямлі»: «Герасімаў (старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў. — **«Зв.»**) ці хто будзе ўзмацняць прафілактыку? Хадзіць па палях, вёсках і гарадах і папярэджваць усіх, што нельга парушаць тое, нельга парушаць гэта?.. Па прынцыпе «лепш прадухіліць і выправіць памылкі, чым пакараць». Ну, вядома ж, толькі як?»

**Па словах беларускага лідара, прафілактыка не павінна быць дзяжурнай фразай. І займацца гэтым пытаннем павінны ўсе дзяржаўныя органы: ад Прэзідэнта і да старшыні сельскага Савета. «Мы ўсіх папярэджваем: красці нельга, падаткі трэба плаціць, прыбытак трэба атрымліваць, зарплату трэба аддаваць», — заўважыў Прэзідэнт.**

У прыклад ён прывёў праблему, на якую часта звяртае ўвагу і сам: «У нас жа кантралёр-касір, памятаеце, я прыклад прыводзіў, 500 долараў у эквіваленце атрымлівае. А нейкі заснавальнік, які наваt дырэктарам крамы не працуе... Яны параскідалі свой заробак па розных банках і атрымлівалі 56 тысяч долараў у месяц, цяпер атрымліваюць 156 тысяч долараў у месяц. Я папярэдзіў, што рабіць так нельга. Ён ім капейкі плаціць, а сам... Прытым вывозіць гэты капітал за межы краіны. У сто разоў вышэйшы заробак у яго, а мы ж дамаўляліся: адзін да васьмі. Пракуратура маўчыць, урад гэтага ўвогуле не бачыць. Вось гэтага не павінна быць». Аляксандр Лукашэнка таксама зрабіў акцэнт на тым, што ўсе фармулёўкі ва ўказе павінны быць канкрэтнымі і адназначнымі.

### ШТО ПРАПАНОЎВАЮЦЬ РАСПРАЦОЎШЧЫКІ ПРАЕКТА ЎКАЗА?

Пра падыходы і навацыі, якія закладзены ў праект указа, далажыў міністр па падатках і зборах Дзмітрый Кійко. Ён адзначыў, што ў аснову гэтага ўказа закладзены нормы дзейнага заканадаўства ў частцы форм кантролю, метадаў кантролю, праверак і іншых працэдур. «Гэтыя нормы сябе зарэкамендавалі, яны даюць кантрольным органам неабходны інструментарый для таго, каб спыняць правапарушэнні, так і прыцягваць да адказнасці суб'ектаў, якія іх дапусцілі. Пры гэтым і формы кантролю, і ўзроўні прыняцця рашэння аб праверках выбудаваны так, каб выключыць залішняе ўмяшанне ў работу суб'ектаў», — адзначыў міністр.

«Ключавыя навацыі ў праекце ўказа заключаюцца ў зрушэнні акцэнтаў у бок прафілактыкі правапарушэнняў, выяўленні прычын і ўмоў, якія могуць садзейнічаць здзяйсненню правапарушэнняў, прыняццю мер па іх ліквідацыі», — канстатаваў Дзмітрый Кійко. Міністр падкрэсліў, што ўсе кантрольныя органы сёння гэтым займаюцца, але дадзены кірунак іх дзейнасці не рэгламентаваны ў адзіным дакуменце. «Ніякіх новых адкрыццяў па прафілактыцы, па сутнасці, тут няма. Прапаноўваецца кансалідаваць усё ў адным дакуменце, які будзе рэгламентаваць кантрольную дзейнасць, і выкласці канкрэтныя мерапрыемствы для выканання гэтымі органамі», — удакладніў ён.

# БЫЦЬ НЕ МОЖА. ЯГО ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ»

## абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці

**«Я не супраць прафілактыкі, няхай гэта будзе прапісана хоць тысячу разоў. Але толькі каб усё не зводзілася да прафілактыкі, бо гэта будзе пустата», — заўважыў Прэзідэнт.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін аспект: «Мяне больш хвалюе іншае. Вось вы пішаце: «Уводзіцца забарона на правядзенне выбарачных праверак добрасумленных суб'ектаў часцей чым адзін раз у пяць гадоў». Адразу пытанне: чаму ў пяць гадоў, а не ў два, тры гады, у дзесяць гадоў? Што такое добрасумленны?» Ён падкрэсліў, што гэта вельмі суб'ектыўная ацэнка. Прэзідэнт таксама спытаў, на падставе чаго вышэйшай службовай асобе, дзяржаўнаму органу забараняецца самастойна вырашаць, каго і дзе правяраць. «Калі мы ім не даверам, калі яны нягоднікі апошнія, давайце іх проста ліквідуем, і ўсё. Двума радкамі ліквідуем Камітэт дзяржаўнага кантролю і вам забаронім займацца кантролем», — іранічна заўважыў кіраўнік дзяржавы. Дзмітрый Кійко растлумачыў, што пад добрасумленнымі маюцца на ўвазе тыя суб'екты, якія павінны будуць адпавядаць пэўным патрабаванням па рабоце арганізацыі, выплаце падаткаў, зарплат... Надзяліць правам зацвярджаць канкрэтны пералік гэтых патрабаванняў прапануецца Савету Міністраў, Генеральнай пракуратуры і Камітэту дзяржаўнага кантролю. Але, звярнуў увагу міністр, калі ў кантрольнага органа будзе інфармацыя, што суб'ект дапускае правапарушэнні (а для выяўлення гэтага ёсць інструментарый), у адносінах да яго можа быць праведзена праверка.

«Вы хочаце сказаць, што пры жаданні Герасімаў не знойдзе нагоды, каб яго праверыць», — удакладніў Прэзідэнт. Па яго словах, пры жаданні кожны кантрольны орган можа знайсці нагоду, каб правесці праверку.

**«Дык навошта мы пішам тое, што не будзе працаваць фактычна? Мы забаранілі, але... А гэта «але» будзе перакрэсліваць тое, што мы забаранілі», — выказаў заўвагу кіраўнік дзяржавы.**

Міністр падкрэсліў, што добрасумленныя плацельшчыкі не вызваляюцца ад праверак, прапануецца праводзіць іх з меншай перыядычнасцю. Гэта важна і для выканання даручэння Прэзідэнта наконт таго, каб кантралёры не перашкаджалі суб'ектам займацца штодзённай дзейнасцю.

Для таго каб перамясціць акцэнты ў дзейнасці кантрольных органаў ад пакарання ў бок прафілактыкі, у праекце ўказа прадугледжваецца шэраг канкрэтных мер. Напрыклад, кантрольныя органы павінны на рэгулярнай аснове інфармаваць суб'екты і мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады аб выяўленых тыповых парушэннях. Прапаноўваецца прымаць рашэнні на карысць суб'екта, што правяраецца, у выпадку няяснасці або невыразнасці прадпісанняў акта заканадаўства.

### ШТО АБ ГЭТЫХ ПРАПАНОВАХ ДУМАЕ КДК?

Некаторыя навацыі, прадстаўленыя ў дакуменце, на нарадзе выклікалі сапраўдную дыскусію. Старшыня КДК Васіль Герасімаў не падтрымаў норму аб тым, каб кантрольныя органы ў публічным доступе, у інтэрнэце выкладвалі інфармацыю аб парушэннях.

**«Калі ўсе кантрольныя і наглядныя органы заўтра пачнуць выкладваць інфармацыю аб парушэннях, то нашы суб'екты гаспадарання будуць самымі дрэннымі ў свеце», — адзначыў ён. «Ці захочуць суб'екты гаспадарання, каб гэта выкладвалася ў адкрытым доступе?» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Васіль Герасімаў падкрэсліў, што гэта пытанне дзелавой рэпутацыі суб'ектаў гаспадарання.**



Старшыня КДК зрабіў акцэнт на тым, што ў прафілактычнай рабоце кантрольных органаў не павінна быць перагібаў, а павальная публікацыя матэрыялаў у інтэрнэце можа да іх прывесці.

«Павінны быць аналітычныя матэрыялы, дзе аналізуюцца не суб'екты гаспадарання, а правапарушэнні. Каб яны чыталі і бачылі, што часта сустракаецца, — нявыплата падаткаў, напрыклад. Ён прачытаў і падумаў: «Не, падаткі трэба плаціць»... Калі трэба Камітэт дзяржкантролю абавязаць, то давайце гэта зробім. Але мне падаецца, што дзяржаўныя органы і так зацікаўлены гэта рабіць», — адзначыў Прэзідэнт. Васіль Герасімаў адказаў, што дзяржкантроль гэтым займаецца.

Старшыня КДК раскрытыкаваў прапанову аб тым, што Камітэт дзяржкантролю з прыняццем дадзенага ўказа абавязаны кіравацца тлумачэннямі ад дзяржаўных органаў з месяцаў. Напрыклад, калі размова ідзе пра выплату падаткаў — ад мясцовай падатковай інспекцыі. Тлумачэнні могуць даваць і іншыя дзяржаўныя органы. Васіль Герасімаў заўважыў, што трактоўкі могуць не супадаць. Нават два супрацоўнікі аднаго дзяржаўнага органа могуць адну і тую ж сітуацыю тлумачыць па-рознаму. Старшыня КДК таксама звярнуў увагу, што, калі суб'ект звяртаецца ў нейкі дзяржаўны орган, ён прадстаўляе пытанне так, як яму выгадна. А што на самай справе адбываецца, ніхто не пераправярае. «Гэта прамы шлях да карупцыі. Калі кожная службовая асоба ў дзяржаве пачне падпісваць паперы суб'ектам гаспадарання, і мы абавязаны будзем гэтым кіравацца, будуць падпісваць усё, што трэба», — папярэдзіў старшыня КДК.

**«Трэба прапісаць адназначна. Ці ўвогуле не пісаць. Калі гэта можа быць. Што гэта за ўказ такі... А так вы мне расказваеце, як вы гэта разумееце і як вы б хацелі гэта бачыць. Гэта «хацелкі» называецца», — заявіў кіраўнік дзяржавы.**

### ДА ЯКОЙ ВЫСНОВЫ ПРЫЙШЛІ ЎДЗЕЛЬНІКІ НАРАДЫ?

Па выніках абмеркавання Прэзідэнт даручыў дапрацаваць праект указа. Зацікаўленым дзяржорганам трэба знайсці кампраміс, перагледзець падыходы і выдаць дакумент належнай якасці. Аб гэтым журналістам пасля нарады расказаў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў. «Савет Міністраў, Генеральная пракуратура і Камітэт дзяржаўнага кантролю зоймуцца гэтай работай для таго, каб выдаць дакумент належнай якасці», — сказаў ён. І няхай канкрэтныя тэрміны не ўстанаўліваліся, зацягваць з гэтай работай ніхто не будзе. Васіль Герасімаў адзначыў: гэта важна яшчэ і таму, што заканадаўства ў сферы кантрольна-наглядной дзейнасці састарэла: Указ № 510 «Аб удасканаленні кантрольнай (нагляднай) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» прыняты ў 2009 годзе. Змянілася і сама сутнасць кантрольнай дзейнасці.

**«Мы больш ўпор робім на папярэджанне і прафілактыку. І кіраўнік дзяржавы ставіць перад намі задачу, каб мы трымалі баланс: калі парушыў — безумоўна, будзеш адказваць і ніякіх выключэнняў у гэтым выпадку не будзе; калі нармальна працуеш — ніякіх прэтэнзій да цябе не будзе і мы не будзем часта наведваць», — растлумачыў старшыня КДК.**

Па яго словах, з 2020 года колькасць праверачных мерапрыемстваў зменшылася ў два разы. «Гэта значыць, кантроль становіцца больш якасным. Мы ідзём туды, дзе сапраўды ёсць праблемы», — дадаў Васіль Герасімаў.

Дзмітрый Кійко ў размове з журналістамі адзначыў, што пры распрацоўцы праекта ўказа ўлічваліся і прапановы мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, бізнес-колаў. Асноўныя элементы дакумента будуюцца на дзейным указе па кантрольнай дзейнасці. Гэтыя меры сёння даволі эфектыўныя. «Разам з тым урад палічыў патрэбным у некаторым сэнсе аптымізаваць кантрольную дзейнасць, узмацніць прафілактычную і тлумачальную работу і дадаткова абараніць правы суб'ектаў, якія правяраюцца», — сказаў міністр. Абмеркаванне на ўзроўні Прэзідэнта паказала, што некаторыя нормы не з'яўляюцца неабходнымі. Напрыклад, прапанова ўрада ўносіць у кнігу ўліку праверак запісы аб усіх наведваннях.

**Васіль Герасімаў адзначыў, што гэта немэтазгодна і толькі створыць нязручнасці ў рабоце службовых асоб і кантралёраў. «Калі, умоўна, губернатар едзе глядзець парадак на зямлі ці пасяўную, то навошта яму ехаць у галаўны офіс гаспадаркі і запісвацца ў тую кнігу? Тое ж датычыцца і старшыні райвыканкама, і мяне як упаўнаважанага па Гродзенскай вобласці», — адзначыў старшыня Камітэта дзяржкантролю.**

Таму кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача ўраду і кантрольным органам (Камітэту дзяржаўнага кантролю, Генеральнай пракуратуры) знайсці кампраміс, які б задаволіў і выканаўчыя органы, і суб'екты, на якіх гэтыя нормы будуць распаўсюджвацца.

Дзмітрый Кійко таксама расказаў журналістам, што Прэзідэнт даручыў вывучыць праект указа на прадмет яго адпаведнасці Канстытуцыі і іншым заканадаўчым актам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — УВАГА І КЛОПАТ АБ ЛЮДЗЯХ

**Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у 13-й сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 29 склікання**

На парадак дня былі вынесены пытанні рэалізацыі ў мінулым годзе рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» на 2021 — 2025 гады, задачы на бягучы год. Згодна са сваім рэгламентам, Савет Рэспублікі каардынуе работу дэпутацкага корпуса ўсёй краіны, прымае меры па развіцці самакіравання.



Фота БелТА.

Перад пасяджэннем Наталля КАЧАНАВА азнаёмілася з выстаўкай, прысвечанай дзейнасці тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гродзенскай вобласці.

## «МЫ ПАВІННЫ БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦАВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ»

Звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што ў Гродзенскай вобласці робіцца вельмі шмат у плане сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. «Укараняюцца новыя формы, вы аб'ядноўваецеся ў грамадскія арганізацыі, якія дазваляюць вырашаць важныя задачы для нашай дзяржавы», — канкрэтызавала яна.

Спікер звярнула ўвагу на актуальнасць тэмы пасяджэння. Яна праінфармавала, што гэтыя пытанні абмяркоўваліся ў кастрычніку 2024 года на пашыраным Прэзідыуме Савета Рэспублікі на базе Дзяржынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Па выніках разгляду пытанняў адпаведным міністэрствам і ведамствам былі дадзены рэкамендацыі, якія, у прыватнасці, датычыліся ўзроўню павышэння адукацыі сацыяльных работнікаў, забеспячэння іх годным заробкам і транспартам.

«Мы выходзім з жыцця, роўна так, як і вы, — аб гэтым пастаянна гаворыць Прэзідэнт, — падкрэсліла Наталля Качанава.

**— Заўсёды, калі мы кажам пра сацыяльную абарону, работу тэрытарыяльных цэнтраў, згадваецца фраза Прэзідэнта: «Такімі, як вы, моладзь, мы ўжо не будзем. А такімі, як людзі пажылога ўзросту, мы будзем». Людзей пажылога ўзросту становіцца ўсё больш у сілу аб'ектыўных прычын: у прыватнасці, добра працуе сістэма аховы здароўя».**

Па словах спікера, дзяржава робіць усё для таго, каб задачы, звязаныя з сацыяльным абслугоўваннем насельніцтва, рэалізоўваліся больш эфектыўна. І на гэта накіроўваюцца немалыя фінансавыя рэсурсы. «Мы павінны больш эфектыўна працаваць з людзьмі, — агучыла Наталля Качанава задачу для дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў. — І ў большай ступені з тымі, хто яшчэ малады. Наша тлумачальная работа аб тым, што робіць дзяржава, як выхоўваць моладзь, і духоўна-маральныя і сямейныя каштоўнасці сёння выходзяць на першы план. Без духоўнага выхавання і адносін да людзей мы нічога не зробім, якія б мы сродкі на гэта ні накіроўвалі».

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што дэпутаты і кіраўнікі ўсіх узроўняў павінны выбудоўваць сваю работу такім чынам, каб людзі, якія знаходзяцца на заслужаным адпачынку, адчувалі ўвагу і павагу з боку нашага грамадства.

**«Нам вельмі шмат трэба для гэтага працаваць, і гэта дае вынік, — канстатавала спікер. — Сёння як ніколі гэта работа выходзіць на першы план».**

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла, што вельмі важна, каб людзі пэўнага ўзросту не заставаліся адны. «З боку дзяржавы сёння зроблена многае, — канкрэтызавала спікер. — Гэта інстытут сацыяльных цэнтраў, гэта сядзелкі, дамы сумеснага пражывання, 98 чалавек у Гродзенскай вобласці жыве ў замяшчальных сем'ях. Людзі міласэрныя і спагадлівыя ў адносінах да тых, хто застаўся адзін. Гэта вельмі важна.

**Мы з боку заканадаўчай улады робім усё для таго, каб тыя пытанні, якія неабходна ўрэгуляваць, былі ўрэгуляваны. І апошнім часам дастаткова было прынята рознага роду навацый, якія ўнесены і ў заканадаўчыя дакументы, і ў нарматыўныя прававыя акты для таго, каб падтрымаць у першую чаргу тых, хто працуе ў сферы сацыяльнай абароны, каб якасна і эфектыўна аказваліся гэтыя паслугі жыхарам нашай краіны».**

АБ ЧЫМ ГАВАРЫЛІ ЎДЗЕЛЬНІКІ СЕСІІ АБЛСАВЕТА

## З АКЦЭНТАМ НА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Як адзначыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА,** «Сацыяльная абарона» — гэта самая жывая праграма. «Яна ахоплівае ўвесь спектр паслуг сацыяльнай падтрымкі нашых грамадзян, асабліва тых, хто апынуўся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, хто мае патрэбу ва ўвазе грамадства і ўлады, гэтым самым фарміруючы каштоўнасныя арыенціры самога грамадства, — удакладніла яна. — У гэтым і заключаецца адна з асноўных мэт сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы: забеспячэнне годнага ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва па працягу ўсяго жыццёвага шляху».

Алена Пасюта праінфармавала, што колькасць непрацаздольных грамадзян Гродзенскай вобласці, ахопленых сацыяльнымі паслугамі тэрытарыяльных цэнтраў, сацыяльных пансіянатаў, уключаючы паслугі дзяржаўнага сацыяльнага заказу, замяшчальныя сем'і, на 1 студзеня 2025 года складае 26,5 тысячы жыхароў (3 % ад агульнай колькасці насельніцтва вобласці і 9,8 % ад атрымальнікаў пенсіі).

«На рэалізацыю ўсіх мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы ў 2024 годзе выдзелена больш за 123 мільёны рублёў, — звярнула ўвагу старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. — Па выніках 2024 года выкананы ўсе ключавыя паказчыкі праграмы. Сфарміравана ўнікальная работа з насельніцтвам, якая пацвердзіла сваю эфектыўнасць. Мы імкнёмся дайсці да кожнага, каму патрэбна дапамога, стварыць умовы для камфортнага пражывання ва ўсіх населеных пунктах, уключыць у рэалізацыю гэтай праграмы не толькі органы ўлады, органы кіравання і самакіравання, але і грамадскія арганізацыі, Маладзёжны парламент, нашых валанцёраў».

## УКАРАНЯЦЬ НАВАЦЫІ І ЗАХОЎВАЦЬ ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ

**Старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Вольга СЯДЗЕЛЬНІК** праінфармавала аб канкрэтных выніках рэалізацыі рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» ў 2024 годзе.

Сістэма сацыяльнага абслугоўвання Гродзенскай вобласці прадстаўлена 19 цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання і 12 пансіянатамі. «З 1 ліпеня 2024 года з улікам змянення нарматыўнай базы ўкараняюцца ключавыя навацыі, — заўважыла Вольга Сядзельнік, кажучы аб удасканаленні сістэмы сацабслугоўвання ў рэгіёне. — Гэта новыя формы і віды работы з захаваннем тых, якія сябе ўжо зарэкамендавалі і карыстаюцца попытам у насельніцтва».

На Гродзеншчыне колькасць грамадзян, якія ахоплены і атрымліваюць паслугі сацыяльных работнікаў і памочнікаў па доглядзе, з 2021 года павялічылася больш чым на 1,3 тысячы чалавек і на 1 студзеня 2025 склала 13,5 тысячы чалавек. «Падтрыманне сацыяльнай актыўнасці пажылых людзей, інвалідаў, рэалізацыя іх творчага патэнцыялу, сацыяльная адаптацыя, прафілактыка кагнітыўных парушэнняў — задача, якая рэалізоўваецца праз працоўную дзейнасць і гуртковую работу», — звярнула ўвагу старшыня камітэта.

У тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання Гродзенскай вобласці працуе 19 аддзяленняў для пажылых і 22 аддзяленні для інвалідаў з умовамі дзённага знаходжання. «Колькасць грамадзян, якія наведваюць такія аддзяленні на пастаяннай аснове, складае амаль 3700 чалавек, — канкрэтызавала Вольга Сядзельнік. — Вельмі запатрабавана сацыяльная паслуга персанальнага асістэнта для грамадзян з інваліднасцю, яна аказана 609 чалавекам. Паслуга, якая ўяўляе сабой гурткі ў хатніх умовах, аказваецца больш як 630 грамадзянам пажылога ўзросту. У развіцці гуртковай работы мы бачым мэтазгоднасць ва ўстанаўленні пэўнага балансу заняткаў, якія праводзяць і спецыялісты тэрытарыяльных цэнтраў, і нашы валанцёры. Сістэма арыентавана на стварэнне стацыянаразамяшчальных форм сацыяльнага абслугоўвання. Сёння стацыянарная форма сацыяльнага абслугоўвання — самая дарагая форма абслугоўвання для бюджэту, і тут ёсць неабходнасць у развіцці паслуг у хатніх умовах для максімальна працяглага пражывання».

Вырашэнне гэтай задачы, як адзначыла Вольга Сядзельнік, бачыцца ў развіцці доўгачасовага догляду як прыярытэтнай формы патранажу ў хатніх умовах ва ўзаемадзеянні сістэм сацыяльнай абароны і аховы здароўя. Такія паслугі атрымліваюць 15 чалавек. «Другая задача — працягнуць развіццё тых форм, якія вельмі добра зарэкамендавалі сябе на Гродзеншчыне, — дадала яна. — У прыватнасці, гэта стварэнне замяшчальных сем'яў. У 2024 годзе гэтай формай сацабслугоўвання было ахоплена 98 чалавек у вобласці. Форма будзе развівацца, найперш у сельскай мясцовасці».

На сучасныя падыходы ў развіцці сацыяльнага абслугоўвання на прыкладзе Мастоўскага раёна звярнула ўвагу **намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама Марына ДАВЫДЗІК.** Аб дзейнасці Навагрудскага раённага Савета дэпутатаў па арганізацыі сацыяльнай падтрымкі і забеспячэнні жыццядзейнасці сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян Навагрудчыны праінфармавала старшыня Навагрудскага раённага Савета дэпутатаў Святлана Каралько. У завяршэнні пасяджэння пастаянная камісія Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў па сацыяльнай палітыцы і справах моладзі прадставіла заключэнне аб эфектыўнасці рэалізацыі рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» на 2021 — 2025 гады ў 2024-м.

**Вераніка КАНЮТА.**

*г. Гродна.*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ТРАДЫЦЫІ, ПРАЦАВІТАСЦЬ І ТЭХНАЛОГІІ»

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў з рабочым візітам наведаў Віцебск і абазначыў арыенціры ў рабоце дэпутацкага корпуса

Ігар СЕРГЯЕНКА ўзяў удзел у 14-й сесіі абласнога Савета дэпутатаў, на якой абмеркавалі пытанні развіцця паўночнага рэгіёна. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ адзначыў, што па выніках мінулага года рэгіён заняў другое месца ў краіне па сацыяльна-эканамічным развіцці. Паспяхова працуе гандаль, тавары з Падзвіння карыстаюцца вялікім попытам. Асаблівай падставай для гонару з'яўляецца тое, што па выніках Года якасці хлеб «Каравай Прыдзвіння» і льняная пасцельная бялізна Аршанскага льнокамбіната ўдастоены Дзяржаўнага знака якасці. З мэтай устойлівага развіцця рэгіёнаў у рамках інвестпраграмы «Адзін раён — адзін праект» на тэрыторыі вобласці знаходзяцца ў распрацоўцы 35 праектаў, 12 з іх цалкам рэалізаваны, прычым дзевяць — летась.



На ААТ «Віцьба» Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу з калектывам прадпрыемства і азнаёміўся з тэхналагічным працэсам.

### У АСНОВЕ — РАБОТА З НАСЕЛЬНІЦТВАМ

«Асноўным кірункам дзейнасці дэпутатаў з'яўляецца, несумненна, работа з насельніцтвам. За перыяд работы 29 склікання падчас прыёмаў грамадзян да народных выбраннікаў звярнуліся амаль дзевяць тысяч чалавек, было праведзена 19,5 тысячы сустрэч у выбарчых акругах. З мэтай вырашэння праблемных пытанняў — медыцынскага і гандлёвага абслугоўвання, уцягнення ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, і іншых — было праведзена 31 выязное пасяджэнне Саветаў дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўняў», — адзначыў Дзмітрый Дзямідаў.

Праз год пасля выбараў цяперашняму складу абласнога Савета дэпутатаў удалося зрабіць нямала добрых спраў на карысць жыхароў роднай Віцебшчыны. Гэта шмат у чым стала магчымым дзякуючы дынамічнаму развіццю вобласці, якая ўпэўнена рухаецца наперад.

**З мэтай павышэння мабільнасці дэпутатаў базавага ўзроўню летась было набыта 38 аўтамабіляў, у планах на бягучы год — папаўненне аўтапарка яшчэ 31 транспартнай адзінкай.**

Вялікую дапамогу дэпутатам у рабоце на месцах аказваюць старэйшыны населеных пунктаў, такую «пасаду» ў вобласці займаюць звыш 2000 чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Ігар Сергяенка пацікавіўся, якія «балевыя» кропкі ёсць у развіцці рэгіёна з улікам таго, што ў вядзенні сельскай гаспадаркі існуе шэраг праблем. Дзмітрый Дзямідаў адзначыў, што Віцебшчына з'яўляецца зонай рызыкоўнага земляробства, аднак у АПК рэгіёна імкнуцца рабіць акцэнт на тэхналогіі. Ён выказаў меркаванне, што ў аграрным сектары варта прырастаць і ў тэмпах, і ў аб'ёмах вытворчасці. Работнікі сельскагаспадарчай сферы шукаюць новыя падыходы, але новаўвядзенні даюць вынікі не адразу.

### ЦІКАВЫ ВОПЫТ І НОВЫЯ ФОРМЫ

**Старшыня Лепельскага раённага Савета дэпутатаў Ігар УРБАН** расказаў аб паспяховых прыкладах работы дэпутатаў на Лепельшчыне. Райсавет праводзіць актыўную работу па ўцягненні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, — гэта значная дадатковая крыніца даходаў. Летась у раёне было прададзена 44 зямельныя ўчасткі на суму звыш 85 тысяч рублёў, тым самым каля васьмі гектараў земляў набылі новых гаспадароў і будуць прыведзены ў парадак. У 2024 годзе праз аўкцыёны прададзена восем дамоў на суму звыш 52 тысяч рублёў, 40 аварыйных збудаванняў былі знесены. Значную ролю ў аказанні паслуг насельніцтву і падтрымцы парадку на тэрыторыі раёна, а таксама з мэтай зніжэння нагрузкі на ЖКГ выконваюць чатыры камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы. Яны займаюцца ачысткай населеных пунктаў ад снегу, дэмантажом і рамонтам агароджаў, выдаленнем пустазельнай расліннасці, закупкай малака ў насельніцтва, ліквідацыяй стыхійных сметнікаў, уборкай збожжавых на асабістых падсобных гаспадарках.

Аб выніках работы Віцебскай абласной Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў расказаў яе **старшыня Віктар ДАРОЖКІН.** Арганізацыя створана з мэтай аб'яднання дзейнасці мясцовых Саветаў усіх узроўняў, узаемадзеяння з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, вывучэння вопыту іншых рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Яе членамі з'яўляюцца дэпутаты Віцебшчыны, якія маюць жаданне ўдзельнічаць у гэтай рабоце. Адзін з кірункаў дзейнасці асацыяцыі — рэалізацыя праектаў грамадзянскіх ініцыятыў.

**Летась на Віцебшчыне было рэалізавана 16 такіх праектаў, сярод іх: рамонт і добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў, месцаў баявой славы часоў Вялікай Айчыннай вайны, стварэнне дзіцячых гульнявых і спартыўных пляцовак у малых гарадах, набыццё электравеласіпедаў для работнікаў сферы сацыяльнага абслугоўвання і шэраг іншых. Сёлета для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне грантаў ужо накіравана звыш 70 праектных заявак з усіх рэгіёнаў, на падтрымку грамадзянскіх ініцыятыў у гэтым годзе плануецца накіраваць не менш за 400 тысяч рублёў.**

Падводзячы вынікі 14-й сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Ігар Сергяенка адзначыў, што падчас інаўгурацыі Прэзідэнт пазначыў асноўныя арыенціры і задачы ў развіцці краіны, якія ў тым ліку адносяцца і да рэгіёнаў. «Агульныя кірункі, як сказаў кіраўнік дзяржавы, — гэта традыцыі, працавітасць і тэхналогіі», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў і дадаў, што канкрэтна паўночнаму рэгіёну ў сваім развіцці неабходна звярнуць увагу на некалькі аспектаў.

### УВАГА — НА КАМФОРТ ЛЮДЗЕЙ

Па-першае, якасць дарожнай сеткі, асабліва мясцовага значэння. Спікер зазначыў, што за апошнія гады ў Беларусі гэта пытанне ўжо добра прапрацавана, аднак у некаторых раёнах людзі дагэтуль маюць праблемы з хуткім перамяшчэннем.

**Дарэчы, у найбліжэйшыя пяць гадоў на тэрыторыі вобласці плануюць адрамантаваць звыш 800 кіламетраў дарог рэспубліканскага значэння. Другой праблемнай сферай з'яўляецца транспартнае абслугоўванне, са зваротамі па гэтай тэме да дэпутатаў прыходзяць людзі амаль у кожным раёне.**

Вырашэнне праблемы знаходзіцца ў абнаўленні і папаўненні транспартнага парка вобласці, аднак гэта нельга зрабіць адначасова.

**«Яшчэ адзін важны для насельніцтва аспект — мадэрнізацыя і павелічэнне магутнасцяў электрасетак, асабліва ў сельскай мясцовасці, дзе насельніцтва больш актыўна стала падключаць электракатлы для ацяплення. Гэта пытанне знаходзіцца на кантролі профільнага міністэрства, але дэпутаты могуць дапамагчы вызначыць, дзе больш за ўсё маюць патрэбу ў такіх паслугах», — сказаў Ігар Сергяенка.**

Нямала зваротаў, па словах спікера, звязана з работай сістэмы ЖКГ. І ў Год добраўпарадкавання асабліва важна далучаць да навядзення парадку на зямлі не толькі адказныя арганізацыі, але і саміх жыхароў вобласці. Праблемным застаецца і аграпрамысловы сектар паўночнага рэгіёна. Тут улады павінны прыняць меры па паляпшэнні сітуацыі, асабліва ў жывёлагадоўлі. У ліку перспектыўных кірункаў для Віцебшчыны Старшыня Палаты прадстаўнікоў назваў больш актыўнае развіццё турызму, а канкрэтна — стварэнне круглагадовых здраўніц, якія карыстаюцца попытам не толькі ў беларусаў, але і ў замежных гасцей.

**«Мы, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, цалкам зацікаўлены ў тым, каб зрабіць паўночны рэгіён яшчэ лепшым, і плячо ў плячо з Саветамі дэпутатаў працуем на карысць Віцебшчыны», — заключыў Ігар Сергяенка.**

### АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ

У гэты дзень Старшыня Палаты прадстаўнікоў наведаў флагман харчовай прамысловасці рэгіёна кандытарскую фабрыку «Віцьба», азнаёміўся з вытворчасцю і тэхналагічнымі працэсамі, а таксама сустрэўся з працоўным калектывам прадпрыемства. Работнікі цікавіліся, якія новыя знешнія пагрозы могуць з'явіцца ў адносінах да нашай краіны, па якім курсе будзе развівацца Беларусь.

«Прадукцыя прадпрыемства даволі запатрабавана не толькі на прылаўках айчынных крам, але і за мяжой. Каля 25 % яе рэалізоўваецца ў Расіі, Кітаі і іншых краінах. Віцебскі вытворца прыкладае ўсе намаганні не толькі для забеспячэння якасці кандытарскіх вырабаў, але і клапоціцца аб прывабнай упакоўцы», — даў ацэнку работы фабрыкі Ігар Сергяенка.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Лоевского РайПО** (продавец) извещает о проведении **8 апреля 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества **в 11.00** по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-290109 общей площадью 376,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/4. Капитальное строение с инв. № 340/С-369 общей площадью 240,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/5. Капитальное строение с инв. № 340/С-3720 общей площадью 113,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/6. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001000005 |
| **Начальная цена** продажи без НДС – **19 400,00** бел. руб. без НДС. **Задаток 1 %** – 194,00 бел. руб. |
| **Условие продажи:** имеется необходимость в последующем выделении земельного участка, необходимого для обслуживания и эксплуатации объектов недвижимости. После проведения торгов Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка, необходимого для обслуживания предмета торгов, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению (выделению) земельного участка и прав на него, государственной регистрации и удостоверению договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет торгов возлагаются на Покупателя |

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, Гомельская область, г.п. Лоев, ул. Батова, 59.

Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 07.04.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителями, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ОДО «ОРБИУС»**
*(УНП 101258669, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 11, корпус 1, ком. 106).*

***Дата и время проведения торгов*: 02 мая 2025 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 29 марта 2025 года по 30 апреля 2025 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ОДО «ОРБИУС» (УНП 101258669), в лице ликвидатора — директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А. А.**

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интеренет-сайте: https://specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

*Закрытое акционерное общество*
***«На Уманской»,***
расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55,
сообщает о выплате дивидендов по акциям:

| | |
|---|---|
| Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям | 28.03.2025 г. |
| Дивиденды, начисленные на одну акцию по результатам работы за 2024 г. | 6 руб. 33 коп. на 1 простую акцию |
| Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям по результатам работы за 2024 г. | 14.01.2025 г. Перечислены одновременно всем акционерам – владельцам простых акций, пропорционально количеству принадлежащих им акций |

УНП 101085067

Общее собрание акционеров

# НОВЫ ФАРМАТ

## Ці абавязкова знаходзіцца дома падчас дыстанцыйнай работы, патлумачылі ў Мінпрацы

З 2024 года ў Працоўны кодэкс былі ўнесены змены, частка іх, у прыватнасці, датычылася ўстанаўлення або адмены дыстанцыйнай работы. Такім чынам, работнікі, якім наймальнік устанаўлівае такі рэжым, могуць працаваць дома. Аднак у гэтай рабоце ёсць шэраг нюансаў. Напрыклад, ці трэба знаходзіцца менавіта дома падчас такой работы і ці адносіцца траўма, атрыманая падчас дыстанцыйнай работы, да вытворчага траўматызму? На топ-5 пытанняў пра дыстанцыйную работу адказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.



***— Ці абавязкова быць дома падчас дыстанцыйнай работы?***

— Не. Наймальнік не абсталёўвае і не замацоўвае «дыстанцыйшчыку» працоўнае месца. Таму такі работнік сам мае права вызначаць месцы, дзе ён ажыццяўляе сваю працоўную дзейнасць: дома, у кафэ, парку і інш.

***— Ці паўплывае дыстанцыйная работа на стаж і пенсію?***

— Не. Такі рэжым не ўплывае на парадак вылічэння працоўнага стажу і налічэнне пенсіі.

***— Ці ўстанаўліваецца «дыстанцыйшчыку» перапынак на абед па часе, пазначаным у працоўным дагаворы/кантракце, або ён магчымы ў любы зручны час?***

— Графік працы і перапынкі для адпачынку і харчавання ўзгадняюцца з наймальнікам і прапісваюцца ў працоўным дагаворы.

***— Калі атрымаў траўму, працуючы дома, гэта лічыцца вытворчым траўматызмам?***

— Не кожны выпадак траўмы падчас дыстанцыйнай работы прызнаецца вытворчым, аднак у Беларусі з 2024 года ёсць магчымасць расследавання такіх няшчасных выпадкаў. Яно праводзіцца на падставе заявы аб няшчасным выпадку ад работніка або яго сваякоў. Няшчасным выпадкам на вытворчасці лічыцца той, што здарыўся з работнікам, які выконвае дыстанцыйную работу, дома пры выкананні ім працоўных абавязкаў або работы па заданні наймальніка з выкарыстаннем абсталявання, інструментаў, механізмаў і прыстасаванняў, дадзеных страхавальнікам.

Пры адмове работніка, які выконвае дыстанцыйную работу, даць асобам, якія праводзяць расследаванне, магчымасць агляду прыналежных яму (арандаваных ім) жылых памяшканняў або іншых законных уладанняў, дзе адбыўся няшчасны выпадак, няшчасны выпадак афармляецца актам службовага расследавання ў адвольнай форме і, адпаведна, не з'яўляецца вытворчай траўмай.

***— Ці абавязаны наймальнік выдаваць ноўтбук/камп'ютар для работы на дыстанцыйцы? І ці можна працаваць на сваёй прыладзе?***

— Наймальнік забяспечвае дыстанцыйнага супрацоўніка неабходным для выканання ім працоўнай функцыі абсталяваннем, калі такі абавязак прадугледжаны працоўным дагаворам. А калі дыстанцыйны работнік выкарыстоўвае ў рабоце ўласныя або арандаваныя ім абсталяванне і сродкі, то ён мае права на кампенсацыю, калі яна таксама была прадугледжана працоўным дагаворам.

# УНЕСЕНЫ КАРЭКТЫВЫ Ў ПАРАДАК ЗАНЯТАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА

## Што змяняецца?



Урад унёс змены ў 18 пастаноў у рамках Закона аб занятасці насельніцтва. Асноўныя новаўвядзенні датычацца падыходаў да працаўладкавання людзей з інваліднасцю, парадку ўстанаўлення броні прыёму на работу, працаўладкавання бацькоў, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, кампенсацыі затрат на аплату працы грамадзян, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі. Пра гэта расказалі ў прэс-службе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

### Працаўладкаванне людзей з інваліднасцю

Удасканальваюцца падыходы арганізацыі і фінансавання мерапрыемстваў па працаўладкаванні людзей з інваліднасцю. Устаноўлены гранічны памер фінансавання мерапрыемстваў па стварэнні і захаванні працоўных месцаў для працаўладкавання інвалідаў за адно працоўнае месца — да 1500 базавых велічынь (63 тысячы рублёў).

Дадатковымі ўмовамі для арганізацый і наймальнікаў, якія жадаюць атрымаць такую падтрымку, з'яўляюцца адсутнасць запазычанасці па выплаце падаткаў і збораў (пошлін), незнаходжанне ў працэсе ліквідацыі або банкруцтва, а таксама захаванне працоўнага месца за інвалідамі не менш як тры гады з дня іх працаўладкавання.

Устаноўлены і гранічны памер бюджэтных сродкаў, што выдзяляюцца на набыццё абсталявання, матэрыялаў, сродкаў індывідуальнай абароны пры фінансаванні мерапрыемстваў па адаптацыі да працоўнай дзейнасці інвалідаў. Ён складае да 200 базавых велічынь (8400 рублёў) за адно працоўнае месца.

Як і раней, адаптацыя да працоўнай дзейнасці інвалідаў можа ажыццяўляцца ў арганізацыях любых арганізацыйна-прававых форм і ў індывідуальных прадпрымальнікаў. Акрамя таго, дакументам устаноўлена ўдакладняльная норма аб тым, што праходжанне адаптацыі да працоўнай дзейнасці магчыма не больш як адзін раз, за выключэннем выпадкаў, калі інвалід па стане здароўя не можа прадаўжаць працоўную дзейнасць па прафесіі, па якой прайшоў адаптацыю, або ў выпадках ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці філіяла.

Удакладнены парадак устанаўлення броні прыёму на работу. Для выключэння дадатковай нагрузкі ўстановлена, што наймальнікам, якім вызначана квота для прыёму на работу інвалідаў, бронь прыёму на работу такіх беспрацоўных не ўстанаўліваецца.

### Работа для абавязаных асоб

У новай рэдакцыі выкладзена Палажэнне аб працаўладкаванні бацькоў, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні.

У прыватнасці, урэгуляваны парадак праходжання абавязанымі асобамі медыцынскага агляду пры прыёме на работу. Адносна грамадзян, якім вынесена судовая пастанова аб працаўладкаванні, прыём на работу ажыццяўляецца арганізацыяй у дзень яўкі на падставе накіравання на работу, выдадзенага органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Пры неабходнасці праходжання папярэдняга абавязковага медыцынскага агляду абавязаная асоба ў дзень прыёму на работу накіроўваецца наймальнікам у арганізацыю аховы здароўя на медыцынскі агляд.

Пашыраны магчымасці па частковай кампенсацыі затрат на аплату працы грамадзян, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, і зарэгістраваных беспрацоўнымі. За кошт сродкаў бюджэту будзе ажыццяўляцца частковае кампенсаванне затрат наймальнікаў па аплаце працы такіх грамадзян, якія прыняты на работу па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і зарэгістраваліся ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне як беспрацоўныя на працягу шасці месяцаў з даты вызвалення.

**Алена КРАВЕЦ.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# З КАРЫСЦЮ ДЛЯ КАШАЛЬКА І ЎРАЖАННЯЎ

## Адпачыць у Беларусі: за год экспарт турпаслуг вырас амаль на траціну

**Усе мы памятаем ковідныя часы, калі турызм (як уязны, так і выязны) фактычна быў пастаўлены на паўзу. Як запэўніваюць спецыялісты, гэтыя не лепшыя часы для галіны засталіся ў мінулым. Зрэшты, ёсць і іншыя для нас пазітыўныя моманты не толькі ў сферы эканомікі, але і геапалітыкі: нягледзячы на розныя забароны латвійскіх улад мясцовыя жыхары актыўна карыстаюцца беларускім бязвізам і ўжо занялі чацвёрты радок у рэйтынгу замежнікаў, якія прыязджаюць у нашу краіну. Пра тое, чым прыцягвае Беларусь замежнікаў і як развіваецца экспарт турыстычных паслуг, карэспандэнту «Звязды» расказаў намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК.**






### ВЫЙШЛІ НА ДАКОВІДНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

Як паведаміў суразмоўца, у 2024 годзе колькасць уязных турыстычных паездак замежных грамадзян у Рэспубліку Беларусь склала 6,6 мільёна. Для параўнання: гэта на 1 мільён больш, чым у 2023 годзе. Калі казаць у грашовым выражэнні, то экспарт турыстычных паслуг склаў 268,1 мільёна долараў, што на 28,4 % больш, чым у папярэднім годзе:

**— Мы бачым, што сёння гэты кірунак дынамічна развіваецца. Станоўчая дынаміка назіралася і год таму. Мы з упэўненасцю можам сказаць, што дасягнулі рэкорднага даковіднага ўзроўню 2019 года.**

Намеснік міністра адзначыў, што гэты пазітыўны трэнд адбываецца не паўсюдна — напрыклад, сёння сусветная турыстычная галіна цалкам яшчэ не выйшла на паказчыкі 2019 года:

— У прыватнасці, не выйшла Еўропа. Мы адна з краін еўрапейскага кантынента, якая перасекла гэты ўзровень. І, больш за тое, па рэйтынгах Сусветнай турыстычнай арганізацыі, мы занялі 48-е месца па колькасці турыстаў, якія наведалі нашу краіну, з больш чым 200 дзяржаў свету.

Калі ацэньваць геаграфію ўязнога турызму, то, безумоўна, **расіяне** займаюць **першы** радок рэйтынгу:

— Тут шмат прычын, самыя асноўныя — адкрытасць дзяржаўных граніц, адсутнасць моўных і ментальных бар'ераў. Гэта асноўны наш рынак, — растлумачыў суразмоўца. — Тэмп росту экспарту турпаслуг склаў 129,6 % да ўзроўню 2023 года, гэта 212 мільёнаў долараў ЗША.

Ён таксама звярнуў увагу, што растуць і іншыя напрамкі: у прыватнасці, на **другім** месцы рэйтынгу — **Турцыя** (з тэмпам росту 125,5 % да ўзроўню 2023 года і амаль 9 мільёнамі долараў экспарту).

**Трэцяе** месца ў спісе стабільна ўтрымлівае **Кітай**:

— Аб'ём 6,6 мільёна долараў, рост на 132 %. Гэтаму спрыяе павелічэнне магчымасцяў лагістыкі: калі раней існаваў адзін авіярэйс паміж нашымі краінамі, то цяпер іх тры.

Суразмоўца адзначае, што павышэнню прывабнасці нашай краіны спрыяюць і кітайскія студэнты, якія навучаюцца ў Беларусі:

— Сёння іх каля 12 тысяч, і яны вельмі актыўныя вандроўнікі. Плюс яны клічуць сваіх родных, сяброў і знаёмых у Беларусь.

На **чацвёртым** месцы рэйтынгу — **Латвія**. Нягледзячы на запалохванне латвійскімі ўладамі ўласных жыхароў, апошнія актыўна карыстаюцца магчымасцямі беларускага бязвізу: закупіцца смачнымі і якаснымі прадуктамі па даступнай цане, лекамі, ды і папраўіць здароўе ў нашай краіне значна танней і



якасней, чым у краінах Еўрасаюза. Таму і звяртаюцца да гэтага акенца магчымасцяў нашы суседзі.

— Якія б яны (латвійскія ўлады. — **Заўв. аўт.**) абмежаванні ні ўводзілі, але латвійскія грамадзяне сёння таксама даюць пэўны плюс ва ўязным турызме ў Беларусь, — растлумачыў Алег Андрэйчык.

Паводле яго слоў, дзякуючы ўвядзенню бязвізавага рэжыму колькасць турыстаў павялічылася па ўсіх краінах Еўропы.

На **пятым** месцы нашага рэйтынгу — **Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Вялікабрытанія** — на **шостым**, на **сёмым — Азербайджан, восьмым — Туркменістан, дзявятым — Казахстан, дзясятым — Швейцарыя.**

— Калі казаць па краінах далёкай дугі, рост экспарту турпаслуг — 127,7 %.

### ЧЫМ ПРЫВАБНАЯ БЕЛАРУСЬ?

Разам з тым варта сказаць, што экспарт турызму — паняцце больш шырокае. Экспарт па артыкуле «паездкі» ўключае больш шырокі спектр выдаткаў замежных турыстаў пры наведванні нашай краіны. І гэты паказчык склаў 819,9 мільёна долараў.

— Тут таксама назіраецца рост, фактычна тэмп складае 107 %. Улічваецца не толькі арганізаваны турыстычны паток, але і выдаткі, якія нясе турыст індывідуальна, — тлумачыць суразмоўца.

Дарэчы, існуе пэўны рэйтынг і па відах турызму, якія найбольш папулярныя ў замежнікаў:

**— На мой погляд, самымі экспартнымі для нашай краіны можна назваць наступныя: першы — лячэбна-аздараўленчы турызм, другі — гісторыка-культурны, трэці — аграэкатурызм. Таксама попытам карыстаюцца экалагічны, паляўнічы і прамысловы турызм.**

Са слоў Алега Андрэйчыка, толькі аб'екты прамысловага турызму летась наведала больш за 260 тысяч турыстаў:

— Гэта не толькі прафарыентацыйны кірунак. Гэта турысты, якія заплацілі за наведванне прамысловых аб'ектаў. Немалаважна, што ў гэтым аб'ёме больш за 52 % складаюць замежныя вандроўнікі.

Чым цікавяцца? БелАЗам, Мінскім трактарным заводам, «Камунаркай», гадзіннікамі «Луч» і многім іншым.

**— Гэта вельмі карысны від турызму для нашай краіны, бо за ім не толькі рэклама вытворчага, прамысловага, эканамічнага патэнцыялу Беларусі, але і прасоўванне нашай прадукцыі за мяжу, — рэзюмаваў намеснік міністра спорту і турызму.**

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

# ШТО ЗМЯНЯЕЦЦА З 1 КРАСАВІКА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ВЫПАДКОВЫЯ ПАДПІСКІ НА ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ МАБІЛЬНЫХ АПЕРАТАРАЎ СТАНУЦЬ НЕДАСТУПНЫМІ

Як паведамляла Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, з 1 красавіка набудуць моц скарэкціраваныя правілы аказання паслуг электрасувязі. Змяненні закліканы абараніць беларусаў ад выпадковага падключэння платных паслуг мабільных аператараў.

Многія сутыкаліся з сітуацыямі, калі яны выпадкова маглі прыняць прапанову аб падпісцы на той ці іншы сэрвіс, проста прайшоўшы адзін раз па дасланай ім спасылцы. Пра тое, што чалавек падпісаны і плаціць за паслугу, многія даведваліся, толькі звярнуўшы ўвагу на павялічаныя рахункі за мабільны. З 1 красавіка такая выпадковая падпіска стане немагчымай.

Згодна з новымі правіламі, падключыць даведачныя або забаўляльныя інфармпаслугі можна будзе толькі адным з наступных спосабаў: накіраванне СМС-паведамлення і USSD-запыту; падача заявы ў офісе аператара; прастаўленне адзнакі ў асабістым кабінеце на сайце або ў мабільным дадатку аператара; электронны лічбавы подпіс.



## УВОДЗІЦЦА БАЗАВЫ САЦЫЯЛЬНЫ ТАРЫФ

Ва ўсіх мабільных аператараў Беларусі з 1 красавіка 2025 года з'явіцца так званы базавы тарыф паслуг. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў летась. Тарыф будзе ўключаць 200 хвілін ва ўсе сеткі, 2 ГБ трафіку і 50 SMS. Што да цаны базавага сацыяльнага тарыфу, то яна будзе складаць каля 12 рублёў.

## НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ЎЕЗДУ Ў ЗОНЫ АДЧУЖЭННЯ



Змяненні закранаюць працэдуру падачы заяў на атрыманне пропускаў. Заяву можна падаць пісьмова, па пошце, кур'ерам, у электронным выглядзе праз партал «Е-Паслуга».

## РЭСПУБЛІКАНСКІ СУБОТНІК ПРОЙДЗЕ 12 КРАСАВІКА

У гэты дзень па ўсёй краіне запланаваны інфармацыйныя акцыі і розныя мерапрыемствы. Любы ахвотны зможа паўдзельнічаць у азеляненні двароў, атрымаўшы інструменты ў камунальнай службе па месцы жыхарства.





## ПАВЫШАЕЦЦА БАЗАВАЯ АРЭНДНАЯ ВЕЛІЧЫНЯ

Ужо з 1 красавіка ў Беларусі будзе перагледжана ў бок павелічэння базавая арэндная велічыня. Адпаведнае рашэнне прыняў урад. Базавая арэндная велічыня — нарматыў, да якога прывязаны памер арэнднай платы пры здачы ў арэнду нерухомасці, што знаходзіцца ў дзяржуласнасці і ўласнасці гаспадарчых таварыстваў. З 1 красавіка базавая арэндная велічыня складзе 18,77 рубля (цяпер — 17,76 рубля). Памер базавай арэнднай велічыні ўрад устанаўлівае штогод з улікам змянення індэкса спажывецкіх цэн.

## НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ЗАЛІЧЭННЯ ПЕРШАКЛАСНІКАЎ



Мінадукацыі абнавіла правілы залічэння першакласнікаў у школы. Новаўвядзенняў некалькі, вызначаны канкрэтны алгарытм дзеянняў. Па-першае, да 1 красавіка будуць перагледжаны і абноўлены замацаваныя за канкрэтнай школай або гімназіяй межы раёна. Па-другое, да 10 красавіка на сайтах усіх школ з'явяцца звесткі аб новых межах мікрараёнаў, колькасці месцаў першакласнікаў, спіс неабходных для залічэння дакументаў. Будзе апублікаваны таксама графік работы прыёмнай камісіі.

З 2 чэрвеня пачнуць прымаць дакументы ад бацькоў дзяцей, якія жывуць у замацаваным за школай мікрараёне. У перыяд з 12 чэрвеня да 15 жніўня можна будзе запісацца на прыём да дырэктара, калі дзіця не прапісана ў раёне, але хоча паступіць у школу. Там жа можна будзе напісаць заяву, якую зарэгіструюць у спецыяльным журнале. Само залічэнне на свабодныя месцы, калі такія ў школе застануцца, будзе праходзіць з 16 да 28 жніўня. Праводзіцца яно будзе ў парадку чаргі заяў, якія паступілі раней.



## АБМЕЖАВАННІ ДЛЯ РЫБАКОЎ

З 20 сакавіка да 18 мая ў Гомельскай і Брэсцкай абласцях дзейнічае нераставая забарона на лоўлю рыбы, яна ўводзіцца штогод. На Міншчыне, Гродзеншчыне і Магілёўшчыне нераставая забарона працягнецца з 1 красавіка да 30 мая, на Віцебшчыне — з 10 красавіка да 8 чэрвеня. У перыяд дзеяння абмежаванняў дазволена лавіць рыбу толькі адной вудай (ці адным спінінгам).

## З'ЯВЯЦЦА НОВЫЯ АВІЯРЭЙСЫ



З 2 красавіка авіякампанія «Белавія» пачне выконваць рэйсы з Брэста ў Санкт-Пецярбург. Яны будуць двойчы на тыдзень — па серадах і суботах. А з 28 красавіка авіяперавозчык пачне выкананне рэйсаў па маршруце Магілёў — Масква. Таксама будзе два рэйсы на тыдзень: у панядзелак і чацвер.

## ВЯЛІКІЯ ВЫХАДНЫЯ



У сувязі з Радаўніцай, якая сёлета прыпадае на 29 красавіка, працоўны дзень з панядзелка 28 красавіка перанеслі на суботу 26 красавіка. Такім чынам, у нас будзе тры выхадныя запар з 27 да 29 красавіка.

# НЕЙРАСЕТКА Ў ДАПАМОГУ



### Тэст на эфектыўнасць

Як адзначыў **начальнік аддзела навукі Міністэрства аховы здароўя Васіль ФІЛАНЮК**, навукова-даследчыя, доследна-канструктарскія і доследна-тэхналагічныя работы ў галіне медыцыны накіраваны перш за ўсё на распрацоўку новых метадаў аказання медыцынскай дапамогі, дыягностыкумаў, медыцынскіх вырабаў для павышэння якасці і даступнасці меддапамогі, у тым ліку высокатэхналагічнай.

Сёлета даследаванні вядуцца ў адпаведнасці з Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмай «Навукова-тэхнічнае забеспячэнне якасці і даступнасці медыцынскіх паслуг», раздзеламі навуковага забеспячэння дзяржпраграм «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» і «Навукаёмістыя тэхналогіі і тэхніка».

На гэтыя мэты сёлета бюджэтам прадугледжана больш як 45 мільёнаў рублёў, на якія дзяржаўнымі медыцынскімі, фармацэўтычнымі арганізацыямі сістэмы Міністэрства аховы здароўя ў цесным супрацоўніцтве з навуковымі арганізацыямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міністэрствамі адукацыі, спорту і турызму будуць рэалізаваны і ўжо рэалізоўваюцца больш як 200 заданняў.

Напрыклад, летась падчас такіх даследаванняў было распрацавана больш як 160 новых метадаў аказання медыцынскай дапамогі, што накіраваны на дыягностыку, лячэнне, медыцынскую прафілактыку сацыяльна значных захворванняў, медыцынскую рэабілітацыю і медыцынскую абілітацыю пацыентаў, пратэзаванне і санітарна-гігіенічны і эпідэмічны дабрабыт.

Да зацвярджэння гэтых метадаў яны апрабуюцца, што пацвярджае іх эфектыўнасць.

— Без пацвярджэння эфектыўнасці не можа быць і зацвярджэння. У адваротным выпадку задаёмся пытаннем: навошта нам неэфектыўныя метады аказання медыцынскай дапамогі? Толькі пасля гэтага новыя метады накіроўваюцца на ўкараненне ў практычную ахову здароўя ад першага да чацвёртага ўзроўню аказання медыцынскай дапамогі, — адзначыў Васіль Філанюк.

### Стаўка на інфармацыйныя тэхналогіі

Як паведаміў **акадэмік-сакратар аддзялення медыцынскіх навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль БОГДАН**, у мінулым годзе Інстытутам біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў распрацавана і ўкаранёна інфармацыйна-аналітычная сістэма разліку рызыкі захворванняў, распрацаваны айчынны інтэрактыўны калькулятар фізічнага развіцця і харчавання дзіцяці для выбару рацыёну з прадуктаў айчынных вытворцаў. Гэты калькулятар прызначаны для выкарыстання як урачамі, так і бацькамі. Створаны першы айчынны інтэрактыўны калькулятар вызначэння біялагічнага ўзросту чалавека і хуткасці старэння.

**Аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі НАН Беларусі распрацаваны нейрасеткавы комплекс сумеснага аналізу біямедыцынскіх выяў і сігналаў для ранняй дыягностыкі захворванняў лёгкіх; створаны прататып сістэмы для скрынінгу дыябетычнай рэтынапатыі па лічбавых малюнках сятчаткі вока. Распрацавана праграмнае забеспячэнне інтэлектуальнага функцыянальнага модуля прагназавання аддаленых наступстваў лячэння пацыентаў дзіцячага ўзросту са злаякаснымі новаўтварэннямі.**

У Інстытуце фізіялогіі распрацавана новая камп'ютарызаваная сістэма дыстанцыйнага маніторынгу і карэкцыі функцыянальных параметраў сардэчна-сасудзістай сістэмы. Вынікі даследаванняў Інстытута радыебіялогіі па колькасці радыенуклідаў у харчовых прадуктах, пітной вадзе, паверхневых вадаёмах у рэперных населеных пунктах выкарыстоўваюцца ў сістэме санітарнага кантролю для правядзення радыяцыйна-гігіенічнага маніторынгу.

У Інстытуце генетыкі і цыталогіі ўпершыню створаны калькулятар разліку верагоднасці развіцця ўскладненняў пры прызначэнні антыагрэгантнай тэрапіі, які дазваляе рэалізаваць персаніфікаванае прымяненне антытрамбатычных лекаў пры ішэмічнай хваробе сэрца.

Пытанні антыбіётыкарэзістэнтнасці вывучаюць у Інстытуце фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Нядаўна тут быў адкрыты Цэнтр медыцынскай мікрабіялогіі і антыбіётыкарэзістэнтнасці.

— Антыбіётыкарэзістэнтнасць — наогул значная праблема сучаснага грамадства і не толькі медыцынская праблема. На жаль, антыбактэрыяльныя лекавыя сродкі вельмі хутка страчваюць сваю эфектыўнасць. Мы ўбачылі гэта на фоне пандэміі ковіду: як значна скарацілася эфектыўнасць прэпаратаў, як узрасла ўстойлівасць да іх у клінічна значных мікраарганізмаў, — адзначыў **дырэктар Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Дзмітрый ТАПАЛЬСКІ.**

### Новыя лекі і клетачныя прадукты

Стварэнне новых найбольш запатрабаваных лекавых і дыягнастычных сродкаў, прыбораў і вырабаў медыцынскага прызначэння ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам аховы здароўя — адна з асноўных задач дзейнасці арганізацый НАН Беларусі.

Летась для сістэмы аховы здароўя створаны новыя прэпараты для лячэння, вырабы медыцынскага прызначэння, дыягнастычныя сістэмы, інфармацыйна-аналітычныя праграмныя комплексы. Дасягненнем айчынных акадэмічных вучоных сталі распрацоўкі, якія з'явіліся прадуктамі поўнага навукова-вытворчага цыкла — ад ідэі іх стварэння, асваення, прамысловага выпуску на прадпрыемствах НАН Беларусі да прымянення ў медыцынскай практыцы. Адметна, што ўся акадэмічная прадукцыя медыцынскага прызначэння мае патэнцыял прамога імпартазамяшчэння і экспарту.

У прыватнасці, у Інстытуце біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў распрацаваны і ўкаранёны арыгінальныя дыягнастычныя сістэмы для вызначэння спецыфічных антыцелаў да пратэінаў клеткавага цыкла, прапанаваны малекулярна-біялагічныя і біямедыцынскія тэхналогіі ацэнкі імуналагічных змяненняў пры вірус-асацыіраваных пухлінах.

Інстытутам біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі створаны арыгінальныя тэхналогіі вытворчасці біямедыцынскіх клетачных прадуктаў. У мінулым годзе такія прадукты былі выраблены для клетачнай тэрапіі пацыентаў з анкалагічнымі захворваннямі, цукровым дыябетам 1-га тыпу, неўралагічнай паталогіяй, захворваннямі апорна-рухальнай сістэмы. Сумесна з установамі Міністэрства аховы здароўя распрацаваны новыя метады дыягностыкі, уключаючы вызначэнне спецыфічнага IgE пры харчовай алергіі, анафілаксіі і інш.

Вынікам міжведамаснага ўзаемадзеяння акадэмічных вучоных з практычнай аховай здароўя стала зацвярджэнне ў 2024 годзе Міністэрствам аховы здароўя дзевяці інструкцый па прымяненні новых метадаў лячэння пацыентаў з прымяненнем біямедыцынскіх клетачных прадуктаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПА ПАЛІЧКАХ

# ІНВЕСТЫЦЫЯ Ў ЗДАРОЎЕ

**Спецыялісты адказалі на пытанні пра дыспансерызацыю**

Для яе праходжання можна ўзяць на працы адзін дзень, які аплаціць наймальнік. Дыспансерызацыя абавязковая для ўсіх і накіравана на папярэджанне і ранняе выяўленне захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, цукровага дыябету, бронха-лёгачных, анкалагічных і іншых хранічных неінфекцыйных захворванняў. Дыспансерызацыю людзі ад 18 да 39 гадоў праходзяць раз на тры гады, з 40 гадоў — штогод. Спецыялісты расказалі, якія абследаванні ўключае дыспансерызацыя і колькі часу займае, ці можна яе прайсці ў прыватных медцэнтрах і чым дыспансерызацыя адрозніваецца ад медагляду.



### НАВОШТА, КАЛІ, КАМУ І ШТО?

Дыспансерызацыя дарослага насельніцтва праводзіцца ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства аховы здароўя, якая ўступіла ў сілу з 1 студзеня. Асноўныя яе мэты — выяўленне хранічных неінфекцыйных захворванняў, у тым ліку анкалагічных, на ранніх стадыях, а таксама іх прафілактыка і выхаванне адказнага стаўлення да свайго здароўя.

Як праінфармавала **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 32-й гарадской клінічнай паліклінікі Мінска Святлана МУХА**, у асноўным дыспансерызацыя праводзіцца на працягу аднаго працоўнага дня. Тым, хто дасягнуў агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, ці тым, каму да гэтай адзнакі засталося пяць і менш гадоў, на гэта адводзіцца два рабочыя дні. Прымаюць у спецыяльных кабінетах дыспансерызацыі, у кожнай паліклініцы іх лік залежыць ад колькасці насельніцтва, якое медустанова абслугоўвае.

Падчас дыспансерызацыі медыцынскі работнік вывучыць вашы папярэднія дыягназы і іншыя меддакументы, якія змяшчаюць інфармацыю пра медагляды і лабараторныя даследаванні. Потым ён робіць медыцынскі агляд, ацэнку фактараў рызыкі і афармляе карту рызык перадпухлінных захворванняў. З ёй вас азнаёмяць, што вы павінны пацвердзіць сваім подпісам, і пасля яна захоўваецца ў вашай амбулаторнай карце.

Далей праводзяцца неабходныя абследаванні, па выніках якіх выяўляюцца (ці не выяўляюцца) фактары рызыкі, і медработнік дае рэкамендацыі па карэкцыі ці ліквідацыі гэтых фактараў. Калі ёсць неабходнасць — пацыента запісваюць да ўрача-спецыяліста, пераважна гэта ўрач агульнай практыкі. Заканчваецца дыспансерызацыя выпіскай з медыцынскіх дакументаў.

### ЯКІЯ АБСЛЕДАВАННІ ТРЭБА ПРАЙСЦІ?

Усе, хто праходзіць дыспансерызацыю, здаюць агульны аналіз крыві, мачы, біяхімічны аналіз крыві з вызначэннем узроўню крэатыніну, алату, трыгліцэрыдаў і агульнага халестэрыну. Акрамя таго, праводзіцца электракардыяграма, рэнтгенфлюараграфічнае абследаванне, жанчыны праходзяць агляднны кабінет.

Ёсць і дадатковыя абследаванні на выяўленне перадпухлінных і пухлінных захворванняў шыйкі маткі, малочнай залозы і прастаты. Так, мужчыны ва ўзросце 50—65 гадоў раз на два гады накіроўваюцца на вызначэнне ПСА (прастатспецыфічнага антыгену). Жанчыны ва ўзросце 49—58 гадоў раз на тры гады накіроўваюцца на мамаграфію, а таксама на ПАП-тэсты (ва ўзросце 21—29 гадоў — адзін раз на тры гады, 30—39 гадоў — раз на шэсць гадоў). На даследаванне на ВПЧ (вірус папіломы чалавека) накіроўваюцца жанчыны ва ўзросце 30—60 гадоў (40—60 гадоў — раз на пяць гадоў, 30—39 гадоў — раз на шэсць гадоў).

### У ПРЫВАТНЫМ ЦЭНТРЫ?

Прайсці дыспансерызацыю ў прыватным медыцынскім цэнтры нельга. А вось вынікі саміх лабараторных даследаванняў, напрыклад, аналізы крыві ці мачы, флюараграфію, электракардыяграму, ПАП-тэст і інш., будуць залічаны. На сам медыцынскі агляд і тэсціраванне па фактарах рызыкі неабходна прыйсці ў паліклініку.

Пры гэтым дыспансерызацыі падлягаюць усе грамадзяне. Калі вы, скажам, праходзілі медагляд для ўладкавання на работу, ад дыспансерызацыі гэта не вызваляе.

### ДЗЕЦЯМ ТАКСАМА ТРЭБА?

Дзеці ўсіх узростаў, пачынаючы з першага дня пасля выпіскі з радзільнага дома, таксама праходзяць дыспансерызацыю. Як расказала **спецыяліст па амбулаторна-паліклінічнай педыятрыі Міністэрства аховы здароўя, галоўны ўрач 6-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Ганна КОТАВА**, дыспансерызацыя праводзіцца ў дзвюх групах: малыя ад 0 да года і ад 1 года да 18 гадоў. У першы месяц жыцця медработнікі наведваюць немаўля дома, пасля штомесяц малое аглядаюць у паліклініцы. У залежнасці ад стану здароўя яму прызначаюцца аналізы, аглядае не толькі педыятр, але і ўрачы-спецыялісты, у прыватнасці хірург ці артапед для выяўлення паталогіі суставаў.

У год усе дзеці праходзяць агляд стаматолага, і з гэтага часу ён становіцца штогадовым, таксама правяраецца вастрыня слыху, зроку, вымяраюцца антрапаметрычныя параметры.

Дыспансерызацыю дзеці праходзяць штогод, і навучальныя ўстановы, ці то дзіцячы садок, ці то школа, патрабуюць даведкі аб стане здароўя. Тэрмін яе дзеяння — год. Пажадана праходзіць дыспансерызацыю ў месяц нараджэння, аднак агляды ўрачоў спецыялістаў сапраўдныя на працягу года, таму іх можна прайсці ў любы зручны час.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

Организация: **ОАО «Белсчеттехника»**
Учетный номер плательщика: 100064838.
Вид экономической деятельности: ремонт машин и оборудования общего и специального назначения.
Организационно-правовая форма: акционерное общество. Орган управления: совет директоров
Единица измерения: тыс. руб. Адрес: 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 декабря 2024 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2024 | На 31 декабря 2023 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 3 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 46 462 | 33 764 |
| Нематериальные активы | 120 | 272 | 2 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 313 | 33 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 260 | 3 650 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **47 307** | **37 449** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1 002 | 1 013 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 698 | 706 |
| готовая продукция и товары | 214 | 304 | 307 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 8 | 81 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2 068 | 1 337 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 250 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 704 | 6 973 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **5 032** | **9 404** |
| **БАЛАНС** | **300** | **52 339** | **46 853** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2024 | На 31 декабря 2023 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 3 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 8 776 | 8 776 |
| Резервный капитал | 440 | 1 | 1 |
| Добавочный капитал | 450 | 30 469 | 25 398 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 11 350 | 11 065 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **50 596** | **45 240** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств, кредиты и займы | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 742 | 1 612 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 297 | 9 |
| по авансам полученным | 632 | 575 | 564 |
| по налогам и сборам | 633 | 485 | 576 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 87 | 106 |
| по оплате труда | 635 | 234 | 296 |
| прочим кредиторам | 638 | 64 | 61 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 1 | 1 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 743** | **1 613** |
| **БАЛАНС** | **700** | **52 339** | **46 853** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь – декабрь 2024 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2024 года | За январь – декабрь 2023 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 3 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 10 969 | 10 388 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (8 637) | (8 166) |
| Валовая прибыль | 030 | 2 332 | 2 222 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 883) | (1 665) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 449 | 557 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 8 042 | 4 296 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (8 367) | (338) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 124 | 4 515 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 178 | 28 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 78 | 6 |
| проценты к получению | 103 | 100 | 22 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (12) | (1) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (12) | (1) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 65 | 112 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 65 | 112 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (15) | (30) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (15) | (30) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 216 | 109 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 340 | 4 624 |
| Налог на прибыль | 160 | (80) | (92) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 260 | 4 532 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 5 096 | 72 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 5 356 | 4 604 |
| Базовая прибыль(убыток) на акцию | 250 | - | 4 |

№ Закл. АЗ-РБ № 2/АО
от 21.03.2025 г.

**Получатель аудиторского заключения**
Генеральный директор
Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (ОАО «Белсчёттехника»)
Хацкевич Валерий Францевич

Подпись о получении:
________________
**21.03.2025 г.**

## Аудиторское заключение
## по бухгалтерской отчетности

*Генеральному директору Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (ОАО «Белсчёттехника») Хацкевичу Валерию Францевичу*

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Белсчёттехника» (далее «Организация») за 2024 год:
Наименование организации: Открытое акционерное общество «ЗАВОД ПО РЕМОНТУ И ТЕХНИЧЕСКОМУ ОБСЛУЖИВАНИЮ ВЫЧИСЛИТЕЛЬНОЙ ТЕХНИКИ».
Местонахождение (юридический адрес): 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 14, каб. 226.
Сведения о государственной регистрации: дата государственной регистрации: 30.07.1991, Минский городской исполнительный комитет.
Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 100064838
состоящей из:

| |
|---|
| Бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2024 года |
| Отчета о прибылях и убытках за январь – декабрь 2024 |
| Отчета об изменении собственного капитала за январь – декабрь 2024 года |
| Отчета о движении денежных средств за январь – декабрь 2024 года |
| Примечаний к бухгалтерской отчетности за 2024 г., предусмотренных законодательством Республики Беларусь |

По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает:
- финансовое положение ОАО «Белсчёттехника» по состоянию на 31 декабря 2024 года;
- финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на 31 декабря 2024, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Руководитель задания,**
**руководитель аудиторской группы,**
**аудитор**
(Приказ № 2АО от 14.01.2025)
(квалификационный аттестат
№ 0002074 от 17.11.2010 г.
рег. номер записи в аудиторском реестре 1751) **Богуцкая М.В.**

Дата подписания аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности: 21.03.2025 г.

**Сведения об аудиторской организации:**
Наименование аудиторской организации: ООО «АудитБизнесКонсалт».
Местонахождение (юридический адрес): 220015, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Пономаренко, 35 а, оф. 322.
Сведения о государственной регистрации: дата государственной регистрации: свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации выдано на основании решения № 1357 Минского городского исполнительного комитета от 04.08.2005 г., регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 190643165.
Номер в реестре Аудиторской палаты: 10055

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ
## за январь – декабрь 2024 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь– декабрь 2024 года | За январь– декабрь 2023 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Движение денежных средств по текущей деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств – всего | 020 | 23 968 | 19 231 |
| В том числе: | | | |
| от покупателей продукции, товаров, заказчиков работ, услуг | 021 | 12 825 | 12 163 |
| от покупателей материалов и других запасов | 022 | 213 | 203 |
| прочие поступления | 024 | 10 930 | 6 865 |
| Направлено денежных средств – всего | 030 | (23 787) | (13 602) |
| В том числе: | | | |
| на приобретение запасов, работ, услуг | 031 | (6 078) | (4 686) |
| на оплату труда | 032 | (3 930) | (3 927) |
| на уплату налогов и сборов | 033 | (5 777) | (4 780) |
| на прочие выплаты | 034 | (8 002) | (209) |
| Результат движения денежных средств по текущей деятельности | 040 | 181 | 5 629 |
| **Движение денежных средств по инвестиционной деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств – всего | 050 | 3 834 | 558 |
| В том числе: | | | |
| от покупателей основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 051 | 91 | 7 |
| возврат предоставленных займов | 052 | 3 643 | 529 |
| проценты | 054 | 100 | 22 |
| прочие поступления | 055 | - | - |
| Направлено денежных средств – всего | 060 | (9 334) | (605) |
| В том числе: | | | |
| на приобретение и создание основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 061 | (8 826) | (104) |
| на предоставление займов | 062 | (508) | (501) |
| Результат движения денежных средств по инвестиционной деятельности | 070 | (5 500) | (47) |
| **Движение денежных средств по финансовой деятельности** | | | |
| Поступило денежных средств – всего | 080 | 61 | 93 |
| В том числе: | | - | - |
| прочие поступления | 084 | 61 | 93 |
| Направлено денежных средств – всего | 090 | (11) | (25) |
| В том числе: | | | |
| на погашение кредитов и займов | 091 | - | - |
| прочие выплаты | 095 | (11) | (25) |
| Результат движения денежных средств по финансовой деятельности | 100 | 50 | 68 |
| Результат движения денежных средств по текущей, инвестиционной и финансовой деятельности | 110 | 5 269 | 5 650 |
| Остаток денежных средств и эквивалентов денежных средств на 31.12.2023 г. | 120 | 6 973 | 1 323 |
| Остаток денежных средств и эквивалентов денежных средств на 31.12.2024 г. | 130 | 1 704 | 6 973 |
| Влияние изменений курсов иностранных валют | 140 | 50 | 68 |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА
## за январь – декабрь 2024 года

| Наименование показателей | Код строки | Уставный капитал | Неоплаченная часть уставного капитала | Собственные акции (доли в уставном капитале) | Резервный капитал | Добавочный капитал | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | Чистая прибыль (убыток) | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| Остаток на 31.12.2022 г. | 010 | 8 776 | - | - | 1 | 25 330 | 6 529 | - | 40 636 |
| Скорректированный остаток на 31.12.2022 г. | 040 | 8 776 | - | - | 1 | 25 330 | 6 529 | - | 40 636 |
| За январь – декабрь 2023 года Увеличение собственного капитала – всего | 050 | - | - | - | - | 72 | 4 536 | - | 4 608 |
| В том числе: чистая прибыль | 051 | - | - | - | - | - | 4 532 | - | 4 532 |
| переоценка долгосрочных активов | 052 | - | - | - | - | 72 | - | - | 72 |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 053 | - | - | - | - | - | 4 | - | 4 |
| Уменьшение собственного капитала – всего | 060 | - | - | - | - | (4) | - | - | (4) |
| В том числе: | | - | - | - | - | - | - | - | - |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 063 | - | - | - | - | (4) | - | - | (4) |
| Остаток на 31.12.2023 г. | 100 | 8 776 | - | - | 1 | 25 398 | 11 065 | - | 45 240 |
| Остаток на 31.12.2023 г. | 110 | 8 776 | - | - | 1 | 25 398 | 11 065 | - | 45 240 |
| Скорректированный остаток на 31.12.2023 г. | 140 | 8 776 | - | | 1 | 25 398 | 11 065 | - | 45 240 |
| За январь – декабрь 2024 года Увеличение собственного капитала – всего | 150 | - | - | - | - | 5 096 | 285 | - | 5 381 |
| В том числе: чистая прибыль | 151 | - | - | - | - | - | 260 | - | 260 |
| переоценка долгосрочных активов | 152 | - | - | - | - | 5 096 | - | - | 5 096 |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 153 | - | - | - | - | - | 25 | - | 25 |
| Уменьшение собственного капитала – всего | 160 | - | - | - | - | (25) | - | - | (25) |
| В том числе: | | - | - | - | - | - | - | - | - |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 163 | - | - | - | - | (25) | - | - | (25) |
| Остаток на 31.12.2024 г. | 200 | 8 776 | - | - | 1 | 30 469 | 11 350 | - | 50 596 |

ОАО «Белсчеттехника» УНН 100064838

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 555 | 558 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 554 | 557 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 46,12 | 41,24 |

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 27 марта 2025 г.
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: www.oao-bst.by

ЖАЛЕЗНАЕ БРАТЭРСТВА

# АД ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ ДА ТУРЫСТЫЧНАГА КАЛІДОРА

## Як развіваецца стратэгічнае беларуска-кітайскае супрацоўніцтва?

Паднябесная імкліва пашырае адкрытасць знешняму свету. Гэта адна з дзесяці галоўных задач кітайскаму ўраду, якія былі пастаўлены ў гэтым месяцы падчас «дзвюх сесій» (штогадовыя пасяджэнні Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў і Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая). Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэньчуань падчас прэс-брыфінгу пасольства. Як адзначыў дыпламат, у гэтым працэсе актыўна задзейнічана і наша краіна: «усё больш кітайскіх кампаній выбіраюць Беларусь для супрацоўніцтва, што прыносіць рэальную карысць народам абедзвюх краін».



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Новыя пункты росту

Каб у поўнай меры ацаніць маштабы кітайскай эканомікі, варта мець на ўвазе, што летась аб'ём валавога ўнутранага прадукту Паднябеснай дасягнуў амаль 135 трыльёнаў юаняў, павялічыўшыся на 5 працэнтаў. Пры гэтым, як падкрэсліў Чжан Вэньчуань, тэмпы росту былі аднымі з самых высокіх сярод найбуйнейшых эканомік свету, а ўклад КНР у рост сусветнай эканомікі захоўваўся на ўзроўні каля 30 працэнтаў.

Кітайскі ўрад мае намер стабілізаваць знешні гандаль і прыток замежных інвестыцый, развіваць новыя пункты росту — «зялёны гандаль» і лічбавую эканоміку (якая ў тым ліку мае на ўвазе шырокае выкарыстанне сучасных перавag штучнага інтэлекту). Развіццю супрацоўніцтва будуць спрыяць ключавыя выстаўкі, сярод якіх — Кітайскі міжнародны імпартны ЭКСПА, Кітайскі кірмаш імпартных і экспартных тавараў (Кантонскі кірмаш), Кітайскі міжнародны кірмаш гандлю паслугамі (CIFTIS), Глабальная выстаўка лічбавага гандлю і Кітайская міжнародная выстаўка спажывецкіх тавараў. Як было заяўлена на прэс-брыфінгу, у Кітаі плануюць забяспечваць прадпрыемствам з замежным капіталам нацыянальны рэжым у набыцці фактараў вытворчасці, атрыманні ліцэнзій, распрацоўцы стандартаў і ўдзеле ва ўрадавых закупках.

Як адзначыў Чжан Вэньчуань, Кітай і надалей будзе паглыбляць шматбаковае і рэгіянальнае эканамічнае супрацоўніцтва, рашуча падтрымліваць шматбаковую гандлёвую сістэму, пашыраць сферу перасячэння інтарэсаў з іншымі краінамі свету і садзейнічаць агульнаму развіццю.

### Насуперак санкцыям

Кітай і Беларусь як усепагодныя і ўсебаковыя стратэгічныя партнёры аказваюць адзін аднаму палітычную ўзаемападтрымку і дэманструюць высокую ступень каардынацыі ў дзеяннях. «Кітайскі бок нязменна рашуча выступае супраць незаконных аднабаковых санкцый і «юрысдыкцыі доўгай рукі», — падкрэсліў Чжан Вэньчуань. — Кітай цвёрда падтрымлівае правы краін абараняць свае законныя інтарэсы, справядлівасць і адкрытасць міжнароднай сістэмы, а таксама садзейнічаць усеагульнаму і скаардынаванаму глабальнаму развіццю».

Як лічыць дыпламат, узаемная падтрымка дазволіла паспяхова перадольваць выклікі санкцый у магчымасці для супрацоўніцтва, а знешні націск — у рухавік развіцця. «У апошнія гады ўзаемадзеянне паміж Кітаем і Беларуссю ў рамках ініцыятывы будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» дасягнула выдатных поспехаў: аб'ём двухбаковага гандлю дынамічна павялічваецца, структура гандлю пастаянна аптымізуецца, — адзначыў пасол. — «Жамчужына» ініцыятывы — Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» — дэманструе стабільнае развіццё, ён прыцягнуў 144 кампаніі-рэзідэнты з 14 краін з планаваным аб'ёмам інвестыцый звыш 1,5 мільярда долараў і стварыў больш чым 3000 працоўных месцаў. Вялікая колькасць ключавых праектаў супрацоўніцтва паспяхова рэалізоўваецца і ўводзіцца ў эксплуатацыю».

Як лічаць у пасольстве, у перспектыве Кітай і Беларусь могуць сфарміраваць трансгранічны турыстычны калідор з Усходу на Захад, такім чынам надаючы новы імпульс гуманітарнаму супрацоўніцтву ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

### Прарыўны дакумент

Адным са стратэгічных дакументаў, рэалізацыя якіх будзе спрыяць пашырэнню двухбаковага супрацоўніцтва, стала пагадненне паміж урадамі Беларусі і КНР аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый, якое было падпісана летась. Як адзначылі ў беларускім Мінэканомікі, прагназуецца, што ў выніку яго рэалізацыі экспарт беларускіх паслуг у Кітай павялічыцца як мінімум на 12,5 %. Пры гэтым найбольшы прырост чакаецца па іншых дзелавых паслугах (плюс 261,1 %) і паслугах сувязі (плюс 20,8 %).

«Пагадненне з'яўляецца прарыўным дакументам. Беларусь стала першай дзяржавай ЕАЭС, якая замацавала стварэнне зоны свабоднага гандлю паслугамі з Кітаем, — адзначылі ў Мінэканомікі. — Для Беларусі пагадненне з Кітаем стала першай двухбаковай міжнароднай дамовай, якая рэгулюе пытанні гандлю паслугамі. Нашы краіны прымаюць на сябе дастаткова высокі ўзровень абавязацельстваў па доступе на рынак паслуг і інвестыцый».

Як паведаміла «Звяздзе» **саветнік Пасольства КНР Ван Жуйцзюань**, у сферы гандлю паслугамі пагадненне ахоплівае шэраг галін, сярод якіх — фінансы, турызм, транспарт і лагістыка, тэлекамунікацыі, камп'ютарныя тэхналогіі. У інвестыцыйнай сферы дакумент змяшчае канкрэтныя палажэнні аб узаемных умовах для інвестараў і гарантыях справядлівага і раўнапраўнага дзелавога асяроддзя.

### У «сям'і ШАС»

Узмацненне ролі Беларусі як паўнапраўнага члена ШАС дасць магчымасць распаўсюдзіць кітайска-беларускі вопыт супрацоўніцтва сярод іншых краін — удзельніц арганізацыі. Як нагадаў **саветнік Пасольства Кітая ў Беларусі Янь Фэн**, летась да КНР перайшло ратацыйнае старшынства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а Беларусь завяршыла працэдуру ўступлення ў «сям'ю ШАС». Сёлета нашы краіны сумесна стануць сведкамі многіх «яркіх момантаў» развіцця гэтай уплывовай глабальнай платформы.

«Ключавым мерапрыемствам стане арганізацыя саміту кіраўнікоў дзяржаў. Гэтай восенню лідары краін ШАС збяруцца ў Цяньцзіні, — паведаміў Янь Фэн. — ШАС пачне новы этап свайго развіцця менавіта з Кітая». Як адзначыў саветнік, таксама будуць праведзены міністэрскія сустрэчы ў такіх галінах, як знешнепалітычныя пытанні, абарона, эканоміка і ахова здароўя, з удзелам усіх дзяржаў-членаў, у тым ліку Беларусі. «Кітай плануе арганізаваць больш за 100 мерапрыемстваў у палітычнай, эканамічнай, гуманітарнай і іншых сферах», — заўважыў Янь Фэн.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**



**Адзін са знакавых праектаў — басейн міжнароднага стандарту, які пабудаваны ў Мінску пры фінансавай падтрымцы Кітая**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного электронного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида».**

**Аукцион состоится 11.04.2025 г. в 11.00 по адресу: https://gostorg.by Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-41596 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание ресторана «Гедимин»), общей площадью 1236,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 23;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-102622 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 72,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 23/1;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-102621 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 59,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 23/2.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000007000075, площадью 0,2364 га (назначение – для строительства и обслуживания ресторана), находящемся по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 23 |
| Обременения | Обременения:<br>- арест судебного исполнителя: денежные средства в полном объеме внести на счет УПИ ГУЮ Гродненского облисполкома, р/с BY70AKBB36429050040874000000, банк – ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код банка – AKBBBY2X, назначение платежа – платеж по производству № 40122004197.<br>- в виде аренды капитального строения, инв. № 420/С-41596, до 5 мая 2025 г. |
| Условия проведения аукциона | 1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязаны заключить с Доверителем договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Доверителю платежного документа, подтверждающего оплату стоимости лота, а также возмещение стоимости затрат на организацию и проведение электронных торгов).<br>2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Поверенного денежные средства в счет возмещения стоимости затрат на организацию и проведение электронных торгов и сумму вознаграждения Поверенного в размере 5 % от конечной цены продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.<br>3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя электронных торгов |
| **Начальная цена продажи** | **Лот № 1:** 1 080 480 руб. (один миллион восемьдесят тысяч четыреста восемьдесят рублей) без учета НДС (НДС не взимается на основании п. 2.30.3 ст. 115 Налогового кодекса Республики Беларусь) |
| **Сумма задатка** | **Лот № 1:** 108 048 руб. (сто восемь тысяч сорок восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Шаг электронных торгов** | 5 % |
| **Адрес и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются на сайте ЭТП https://gostorg.by **Последний день приема заявлений – 09.04.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.02.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://gostorg.by | |



**Информация о решениях, принятых на очередном общем собрании акционеров от 20.03.2025 г.**

**Открытого акционерного общества «ЦентроСтройОфис»**

***(г. Минск, ул. Монтажников, 39-208)***

По первому вопросу решили: утвердить отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 г. и основных направлениях деятельности общества в 2025 г. Решение принято единогласно.

По второму вопросу решили: принять к сведению отчет наблюдательного совета общества за 2024 г. Решение принято единогласно.

По третьему вопросу решили: принять к сведению отчет ревизионной комиссии общества за 2024 г. Решение принято единогласно.

По четвертому вопросу решили: утвердить бухгалтерскую отчетность за 2024 г. Решение принято единогласно.

По пятому вопросу решили: по итогам 2024 г. не производить распределение прибыли и дивиденды не начислять. Решение принято единогласно.

По шестому вопросу решили: делегировать полномочия наблюдательному совету по определению в 2025 г. и первом квартале 2026 г. направлений использования чистой прибыли. Решение принято единогласно.

По седьмому вопросу решили: избрать членов наблюдательного совета общества в количестве 4 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По восьмому вопросу решили: избрать членов ревизионной комиссии общества в количестве 2 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По девятому вопросу решили: установить вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии. Решение принято единогласно.

По десятому вопросу решили: утвердить решения наблюдательного совета за период с 12 марта 2024 г. по 19 марта 2025 г. Решение принято единогласно.

УНП 191303207

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидский завод электроизделий», Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, д. 4. УНП 500021270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Толстого, д. 14Б, 14Ж/18** | |
| **Здание склада запчастей и полуфабрикатов** (**1353,9 кв. м,** 420/С-3235, составные части: 4 пристройки); **сооружение благоустройства (948,7 кв. м,** 420/С-102175); **газон обыкновенный № 16** (102,5 кв. м) | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 3,6915 га предоставлен на праве долевой аренды (доля 991/1250, срок действия: по 21.06.2071) для строительства и обслуживания производ. площадки № 2. После продажи земельный участок будет разделён в долях. ***Обременения*** – аренда части склада площадью 348,2 кв. м | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 317 041,35 бел. руб.** (снижена на 15 %) | |
| **Лот № 2** Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее дер. Юровичи** | |
| **Охотничий домик** (**58,0 кв. м,** 420/С-3357, составные части: терраса) | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,0613 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания охотничьего домика | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 6 453,49 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| Шаг электронных торгов: 5 % от текущей цены лота | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать)** дней после проведения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета торгов, такая оплата должна быть произведена в течении **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лоту № 1 – 4 % и по лоту № 2 – 8 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.02.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 16.04.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35; auction@cpo.by** | |

**Информация о решениях, принятых на очередном общем собрании акционеров от 20.03.2025 г.**
**Открытого акционерного общества**
**«ЭнКоСтрой»**
***(г. Минск, ул. Монтажников, 39-201)***

По первому вопросу решили: утвердить отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 г. и основных направлениях деятельности общества в 2025 г. Решение принято единогласно.

По второму вопросу решили: принять к сведению отчет совета директоров общества. Решение принято единогласно.

По третьему вопросу решили: принять к сведению отчет ревизионной комиссии общества. Решение принято единогласно.

По четвертому вопросу решили: утвердить бухгалтерскую отчетность ОАО «ЭнКоСтрой» за 2024 г. Решение принято единогласно.

По пятому вопросу решили: по итогам 2024 г. не производить распределение прибыли и дивиденды не начислять. Решение принято единогласно.

По шестому вопросу решили: делегировать полномочия совету директоров по определению в 2025 г. и первом квартале 2026 г. направлений использования чистой прибыли. Решение принято единогласно.

По седьмому вопросу решили: избрать членов совета директоров общества в количестве 6 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По восьмому вопросу решили: избрать членов ревизионной комиссии общества в количестве 2 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По девятому вопросу решили: установить вознаграждение членам совета директоров и ревизионной комиссии. Решение принято единогласно.

По десятому вопросу решили: утвердить решения совета директоров за период с 12 марта 2024 г. по 19 марта 2025 г. Решение принято единогласно.

УНП 191303197

# НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ...

## Памяць — як найлепшы гарант міру

Гэты ліст прыйшоў па звычайнай пошце, у звычайным канверце. Невялічкі зусім — адна староначка...
І шэсць фотакартак, з якіх не проста ў вочы, а ў душу нібыта паглядзелі такія маладыя, такія прыгожыя людзі...

Не змірыцца з тым, што іх болей няма, што нехта загінуў на той клятай вайне, нехта — застаўся калекам, хутка памёр... Хіба адзін з сотняў ветэранаў (на пачатак года іх у краіне меней за тысячу) жыў доўга: паспеў нарадзіць дзяцей, насадзіць дрэў, набудаваць дамоў, напісаць і выдаць свае мемуары, зняць фільмы, пакінуць зборнікі паэзіі і прозы, оперы, карціны...

Але ж трэба помніць, што яе, і сапраўды Вялікую Перамогу, здабывалі не толькі маршалы і генералы, не толькі творцы, — мільёны радавых чырвонаармейцаў; што сярод героеў-партызан, апроч К. С. Заслонава, П. М. Машэрава, М. П. Шмырова (бацькі Міная), была і цётачка Мар'я, якая на апошніх месяцах цяжарнасці хадзіла ў разведку; быў дзед Базыль з суседняга мястэчка...

Іх фотакарткі цяпер хіба ў сямейных альбомах, іх імёны прозвішчы — на іх жа надмагільных помніках, а трэба ж, каб і ў памяці... Не толькі родных.

Такім чынам — ліст:



*«Мой тата, гвардыі старшы лейтэнант Мікіта Фёдаравіч Бачанкоў, нарадзіўся 1 красавіка 1911 года на Смаленшчыне і звязаў сваё жыццё з арміяй. Спачатку была тэрміновая служба, затым звыштэрміновая, удзел у фінскай вайне, дзе загінулі дзясяткі тысяч салдат. Тата потым казаў, што да месца дыслакацыі іх лыжнае падраздзяленне ў літаральным сэнсе ішло па заснежаных трупах. Там ён абмарозіў ногі.*

*Пасля гэтага яго накіравалі ў Разанскае аўтамабільнае вучылішча, а па заканчэнні — ужо на фронт: з перапынкамі на шпіталі ён прайшоў праз усю вайну. Найцяжэйшае раненне атрымаў пры вызваленні Чэхаславакіі і да лістапада 1945-га знаходзіўся на лячэнні.*



*...Гэтыя небагатыя звесткі я атрымала ўжо ў сталым веку па надпісах на адваротных баках татавых ваенных фатаграфій. Сам ён рана пайшоў з жыцця, вайна падкасіла яго здароўе, а лекаў тады амаль не было. Я памятаю хіба таблеткі белага і чырвонага стрэптацыду. Мы з сястрычкай з імі гулялі.*

*Са шпіталя тату прыносілі яшчэ бутэлькі хлорыстага калію (у той час вельмі дэфіцытнага), але ж я чакала дактарку не з-за лекаў. Жанчына здавалася мне вельмі прыгожай і добрай, бо заўсёды песціла мяне.*

*Вось якія дробязі западаюць у памяць з дзяцінства!*

*...Узнагароды мой тата не насіў, але на кіцелі і пінжаку былі прымацаваны ордэнскія планкі і нашыўкі за раненні. Мне падабаліся жоўтая і чырвоная — іх я бачыла, калі тата браў мяне на рукі.*

*Як і ўсе франтавікі таго часу, ён не любіў успамінаць, расказваць пра вайну, але з гутарак за святочным сталом я зразумела, што яна — гэта не толькі подзвігі і геройства. Гэта пекла і найцяжэйшая штодзённая праца на мяжы чалавечых магчымасцяў, калі па глыбокім снезе, па балоце, у бездараж людзі на сваіх плячах выносілі тэхніку, піхалі машыны...*

*Чула яшчэ, што ні ў адным войску няма больш такіх салдат, як савецкія, — з іх цярпеннем і прагай справядлівай адплаты за спаленыя, разрабаваныя, сцёртыя з твару зямлі гарады і вёскі.*



*Тата меў спецыяльнасць аўтамабіліста і ганаровае званне гвардзейца. Гэта дае мне падставы меркаваць, што ён ваяваў у артылерыі. Ён узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (а яго проста так не давалі), медалямі «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», за «Перамогу над Германіяй».*

*Вось і ўсё, што я помню».*

**Гэты ліст віцябчанка Святлана Мікітаўна Бачанкова напісала пра свайго тату.**
**Вы — можаце пра свайго... «Звязда» — праз публікацыю лістоў і здымкаў — паспрабуе засведчыць, што ў нас сапраўды ніхто не забыты і нішто не забыта, бо, паводле Васіля Быкава, менавіта «памяць аб крывавых выпрабаваннях у мінулым, вайне, ёсць найлепшы гарант міру і існавання розных народаў на нашай зямлі».**
**Пішыце!**








## • На фронце

Войскі 3-га Беларускага фронту 29 сакавіка завяршылі ліквідацыю акружанай усходне-прускай групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кёнігсберга. Праціўнік, заціснуты на мысе Кальхольцэр-Хакен, рабіў адчайныя намаганні, каб пратрымацца яшчэ некалькі дзён, разлічваючы за гэты час вывесці морам рэшткі сваіх разгромленых злучэнняў. Савецкія войскі сарвалі гэты план немцаў. **«Усе прычалы, якія засталіся ў руках ворага, няспынна бамбардыраваліся авіяцыяй і абстрэльваліся артылерыяй. Тым часам нашы танкісты і пехацінцы нанеслі рашаючы ўдар па апошняму аплоту немцаў — прыбярэжнаму пасёлку Бальта і акружаючым яго вышыням. Немцы сканцэнтравалі ў гэтым раёне адборныя атрады эсэсаўцаў. Пад прыкрыццём магутнага артылерыйскага агню, савецкія падраздзяленні рушылі ў атаку і пасля жорсткага бою авалодалі пасёлкам Бальта», — паведамляла «Звязда» ў гэты дзень.**

Услед за гэтым нашы байцы занялі ўмацаваныя вышыні. У баі за пасёлак было знішчана звыш трох тысяч гітлераўцаў, пераважна эсэсаўцаў і штрафнікоў. Захоплена 1800 палонных, шмат танкаў, палявых гармат, кулямётаў, аўтамашын, склады з боепрыпасамі і ваеннай маёмасцю. Імкліва прасоўваючыся на поўнач, нашы войскі занялі апорны пункт Кальхольц. Атрады нямецкіх афіцэраў, якія яго абаранялі, былі знішчаны. Услед за падзеннем Кальхольца арганізаванае супраціўленне ворага спынілася. Немцы сталі натоўпамі здавацца ў палон. Ліквідацыя буйной групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кёнігсберга была паспяхова завершана.



Войскі 2-га Беларускага фронту прадаўжалі баі па ачышчэнні ад праціўніка ўсходняй часткі горада Гданьска (Данцыга) і знішчалі групу войск немцаў, прыціснутую да ўзбярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад горада Гдыня.

Войскі 3-га Украінскага фронту ў выніку імклівага наступлення 29 сакавіка авалодалі гарадамі і важнымі вузламі дарог — Сомбатэль, Капувар і, заняўшы горад Кёсег, выйшлі на аўстрыйскую граніцу, а таксама з баямі занялі больш чым 100 іншых населеных пунктаў. У тым ліку буйныя — Фарад, Міхалы, Белед, Чаніг, Бюк, Надзыгенч, Веп, Пецэль, Ікервар, Дзьерцьнош, Балтавар, Заласанта, Рээі і чыгуначныя станцыі Тоткерэстур, Белед, Рэпчэлак, Хедзьфалу, Бюк.

У баях за 28 і 29 сакавіка войскі фронту, паводле звестак Савецкага інфармбюро, узялі ў палон больш чым 18 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 115, танкаў і самаходных гармат — 71, палявых гармат — 102.

## • У тыле

Тры гады над Брэсцкай вобласцю вісела чорная жахлівая ноч крывавага гітлераўскага тэрору. Фашысты расстралялі тут звыш 54 тысяч чалавек — жанчын, старых і дзяцей, пагналі на катаргу ў Германію 16 624 чалавекі, пераважна моладзь. «Стогн і плач стаяў над зямлёю, гарэлі гарады і вёскі, маці аплаквалі сваіх закатаваных, расстраляных і вывезеных у нямецкае рабства мужоў, сыноў і дочак», — пісала «Звязда».

**У газеце таксама прыводзіліся лічбы па выніках нямецкага «гаспадарання» ў сельскай мясцовасці: захопнікі адабралі ў сялян 40 932 кані, 93 918 кароў, 122 962 свінні, 170 336 авечак і коз, спалілі і знішчылі каля 16 тысяч жылых дамоў і больш чым 26 тысяч надворных пабудоў.**

Дзень 28 ліпеня 1944 года назаўсёды застанецца ў памяці брастаўчан — тады поўнасцю была вызвалена вобласць: «Як толькі адгрымелі апошнія стрэлы, сяляне сабраліся на свой першы абласны сход, каб абмеркаваць і намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па хутчэйшаму аднаўленню сельскай гаспадаркі, каб абмеркаваць, як лепш і хутчэй дапамагчы нашай Чырвонай Арміі ў яе свяшчэннай вызваленчай вайне». На ім былі прыняты абавязацельствы сацыялістычнага спаборніцтва.

Перамогі Чырвонай Арміі выклікалі хвалю ўздыму сярод людзей. «Яны датэрмінова выканалі план збожжанарыхтовак, мясапаставак, поўмільёна пудоў збожжа і амаль столькі-ж бульбы здалі ў фонд Чырвонай Арміі», — паведамляла наша газета.

Як толькі былі адноўлены органы савецкай улады, у вобласці неадкладна пачалася раздача зямлі непасрэдным яе гаспадарам-сялянам. **«Звязда» пісала, што ў Камянецкім раёне зямля былога маёнтка «Клепачы» была размеркавана паміж сялянамі вёсак Ямінка, Клепачы і Булевічы. Зямля маёнтка «Ступічава» — паміж сялянамі вёсак Ступічава і Навіцковічы, маёнтка «Шышава» — паміж сялянамі вёсак Чарнакі і Шышава і г. д.**




Паспяхова надзялялі сялян зямлёй у Жабінкаўскім і многіх іншых раёнах. Атрымліваючы надзелы, сяляне дзякавалі партыі і ўраду за тое, што яны далі магчымасць працаваць на сваёй зямлі, на карысць сабе і сваёй савецкай дзяржаве.

**«У мэтах дапамогі насенным матэрыялам сем'ям франтавікоў, інвалідаў Айчыннай вайны і партызан, а таксама гаспадаркам, якія вельмі пацярпелі ад акупантаў, у кожным сельсавеце ствараўся спецыяльны фонд, — паведамляла «Звязда». — Народ ахвотна даваў для гэтых мэт збожжа, бульбу, грошы». У Бытчанскім сельсавеце Кобрынскага раёна было сабрана больш чым 24 тон збожжа, у Параслянскім сельсавеце Пружанскага раёна — 19 тон збожжа і 8684 рублі грашыма і г. д. Усяго па вобласці ў фонд дапамогі паступіла каля тысячы тон збожжа.**

Трэба было зрабіць яшчэ многае, каб хутка і якасна правесці сяўбу, каб заваяваць першынство ў сацыялістычным спаборніцтве. Але на вызваленай зямлі людзі гатовы былі працаваць з імпэтам і натхненнем.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ВЫПУСКАЕЦЦА ПАМЯТНАЯ БАНКНОТА НАМІНАЛАМ У 80 РУБЛЁЎ

**Нацыянальны банк краіны ў апошні дзень сакавіка выпусціць у абарачэнне памятныя манеты і банкноту серыі «80 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».**







З іх сярэбраная манета наміналам 20 рублёў, будзе мець тыраж 2500 штук. А меднанікелевая наміналам 1 рубель — тыраж 5000 штук. Манеты маюць форму круга, з пярэднім і адваротным бакамі — кант, які выступае па акружнасці. Бакавая паверхня манет з насечкай. На рэверсе манет: у цэнтры — стылізаваныя выявы кулявой адтуліны, званоў, узораў ваеннай тэхнікі і ўзбраення на фоне руін і надпіс «80 гадоў Перамогі»; унізе — стылізаваная выява трох гваздзікоў чырвонага колеру.

Упершыню ў гісторыі нашай банкаўскай сістэмы выпускаецца памятная банкнота наміналам 80 рублёў і тыражом 80 тысяч штук.

На адным баку банкноты: злева ўверсе — надпіс «НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» і год выпуску, справа ўверсе — надпіс «80 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне»; у цэнтры — выявы мануманта Брэсцкай крэпасці «Мужнасць», скульптуры «Радзіма-маці», знакавых для Беларусі архітэктурных збудаванняў і сімвалаў.

На адваротным баку: злева ўверсе — надпіс «НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» і год выпуску, справа ўверсе — надпіс «80»; у цэнтры — выява рукі маці, якая трымае руку дзіцяці, на фоне нацыянальнага арнаменту, выявы архітэктурнага комплексу «Вароты Мінска» і кветкі яблыні, правей — буслы, што ўзлятаюць; злева ўнізе — надпіс «80 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты і банкноты з'яўляюцца законным плацежным сродкам нашай краіны і абавязковыя да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

У прэс-службе Нацбанка паведамілі, што інфармацыя аб чаканых паступленнях, адпускных цэнах і наяўнасці памятных манет і банкнотаў у касе Нацыянальнага банка, а таксама планаваных датах продажаў памятных манет і банкнотаў размешчана на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка ў раздзеле «Банкноты і манеты».

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Гомельский домостроительный комбинат»** (продавец) извещает о проведении **18 апреля 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества в **12.00** по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| Наименование имущества |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223043 площадью 1252 кв. м (Главный корпус ТО автомобилей, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: две пристройки, сени, пять сараев, навес, забор, мощение (асфальтобетонное), ворота металлические). Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223047 площадью 126 кв. м (контрольно-пропускной пункт, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: пристройка, пристройка (диспетчерская), пристройка (проходная), пристройка (складские помещения). Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223045 площадью 269 кв. м (бытовое здание, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: две пристройки) |
| Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000005008411 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 287 |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 709 680,00 бел. руб. **Задаток** с НДС – **10 000,00** бел. руб. |

**Продавец:** ОАО «Гомельский домостроительный комбинат», г. Гомель, ул. Лазурная, 17.

Контактный телефон +375 (29) 373-08-42.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца: р/с BY12BLBB 30120400071166001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071166.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17.04.2025 г. в 15.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.**

Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) банковских дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в следующем порядке: **50 %** – в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи, оставшуюся часть **равномерными ежемесячными** платежами в течение **6 (шести)** месяцев с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов 1 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости объекта. Аукцион проводится в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36; +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**



# ТЭСТ НА ШЧЫРАСЦЬ

## Культурнымі праектамі і акцыямі, прысвечанымі 80-годдзю Перамогі, імкнуцца ахапіць больш моладзі

Адна з самых свежых навін: музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны абвяшчае песенны конкурс «Сэрца спявае – Перамога жыве». Але сёлета што ні праект, у рамках якога гавораць пра падзеі вайны ў Беларусі, — то ў немалой ступені з разлікам на тых, чыя свядомасць праходзіць этап станаўлення. Праўда, імкнуцца трымаць і ўвагу дарослых: каб не гублялі пільнасці (згодна з Фучыкам)... Адпаведна, ёсць прапановы. Учытайцеся ў назвы новых праектаў Міністэрства культуры, прымеркаваных да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне...

— Наша місія — захаванне гістарычнай памяці і праўды, — адзначае **Кацярына КАТЛОЎСКАЯ, загадчыца культурна-адукацыйнага аддзела музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.** — Нядаўна ў нас прайшоў міжнародны форум «Памяць і інавацыі» — мы стараемся ісці ў нагу з часам і падключаць новыя мультымедыйныя магчымасці, ладзім міжнародныя канферэнцыі. 23 красавіка адбудзецца канферэнцыя «Подзвігу народа жыць у вяках». Прыцягваем удзельнікаў не толькі з Беларусі, але і з Расійскай Федэрацыі, адбываюцца сумесныя семінары, праекты. Беларускія наведвальнікі могуць пазнаёміцца з выставачным праектам «Рарытэты музея»: у яго рамках прадстаўлены прадметы, якія выстаўляюцца вельмі рэдка. За год будзе дванаццаць выставак асобных прадметаў. Напрыклад, мы знаёмілі з унікальнымі экспанатамі калекцыі самаробнай партызанскай зброі (пісталет-кулямёт Васіля Каржа). Прадставілі рукапісны гросбух партызанскай брыгады «Полымя» (гэта калекцыя мае статус першы ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь). Цяпер выстаўляем абразок Ефрасінні Полацкай, які ўсю вайну падтрымліваў свайго ўладальніка. Многія жыхары краіны ўжо сустракаліся з намі ў рамках патрыятычнай акцыі «Наш абавязак — памятаць».

**Цягам 2025 года плануем наведаць усе населеныя пункты Рэспублікі Беларусь, якія ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Старт — 11 красавіка ў Брэсце. Далей мабільная экспазіцыя паедзе па розных населеных пунктах Беларусі. Да 9 мая ў музейным філіяле, ваенна-гістарычным комплексе «Старая граніца», што за 30 кіламетраў ад Мінска, збіраемся правесці сямейнае свята.**

Маладзёжны тэатр эстрады разам з Міністэрствам культуры з'яўляюцца арганізатарамі агульнарэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Разам з мастацтвам». Яе трэці этап прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі. Наогул, запланавана 18 праектаў, якія адбудуцца ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Старт акцыі, што праходзіць пад дэвізам «Слава Пераможцам!», дадзены 24 лютага на базе Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



— На цяперашні момант мы паспелі наведаць некаторыя сталічныя навучальныя ўстановы, праехалі па рэгіёнах — Чэрвень, Салігорск, Беразіно... — гаворыць **дырэктар Маладзёжнага тэатра эстрады Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.** — Творчая група, якая складаецца з папулярных артыстаў тэатра эстрады і вядомых медыйных асоб, прыязджае ў той ці іншы населены пункт і кантактуе з юнацкай аўдыторыяй — навучэнцамі, студэнтамі, працоўнай моладдзю. Ідуць дыялогі, гучаць успаміны пра родных і блізкіх, якія ўдзельнічалі ў той вайне. У канцэртнай частцы бяруць удзел і мясцовыя творчыя калектывы. Акцыя ператвараецца ў маштабны праект па патрыятычным і прафарыентацыйным навучанні нашага маладога пакалення.

Летась Маладзёжны тэатр эстрады выпусціў адмысловую прэм'еру гістарычнай меладрамы «Без тэрміну даўнасці». Гэты твор напісаны паводле рэальных падзей, прататыпам галоўнага героя стаў беларус, контрразведчык, які прайшоў вайну, перажыў асабістую драму — страціў жонку і дзвюх дачок, але не згубіў надзеі іх знайсці... Паказы будуць арганізаваны ў першыя дні красавіка спецыяльна для навучэнцаў сталічных устаноў адукацыі.

Перасоўныя праекты ахопяць розныя гарады Беларусі. Яны рэалізоўваюцца не толькі музеямі, але і сумесна — бібліятэкамі, установамі клубнай сістэмы дзеля таго, каб максімальна паглыбіць у гістарычныя праекты, у тым ліку праз літаратуру і культурную спадчыну, адзначае **Надзея АЎДЗЕЙ, кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі:**

— Да памятнай даты 80-годдзя Вялікай Перамогі ў нас запланавана больш за 150 мерапрыемстваў, у тым ліку па лініі Саюзнай дзяржавы — напрыклад, канцэрт на 9 Мая. Праводзіцца агульнарэспубліканская акцыя «Беларусь памятае», канферэнцыі і семінары ў рамках навуковай супольнасці, дзе ўздымаецца тэма Вялікай Айчыннай вайны, у прыватнасці гістарыяграфічны складнік гэтага пытання.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


Открытое акционерное общество

## «Стройдетали»

*222410, г. Вилейка, ул. Стахановская, 134*

### Раскрытие информации эмитента за 2024 год

**4. Доля государства в уставном фонде эмитента** – 0 %.

| **5-6. Информация о дивидендах и акциях** | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 197 | 197 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 0 | 0 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 197 | 197 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 2 | 2 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0 | 190.51 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0 | 2.5114 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0.0000 | 0.0000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0.0000 | 0.0000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0.0000 | 0.0000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0.0000 | 0.0000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0.0000 | 0.0000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 0 | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 24.12.2024 | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | С 27.12.2024 по 31.03.2026 | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 181,39 | 194,6 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 0 |

| **7. Отдельные финансовые результаты деятельности ОАО** | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 14383,00 | 16866.00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 16024,00 | 17651.00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -1950,00 | -1021.00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | -1641,00 | -785.00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -263,00 | -412.00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -46 | 176.00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 0 | 36.00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -1950 | -1057.00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 2640,00 | 4590.00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0,00 | 0.00 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 14,00 | 24.00 |

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:** 27 марта 2025 г.
**Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности:** 04.03.2025.
**Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:** аудиторская организация.
Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Капиталаудит»,
местонахождение: 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65а, оф. 230, сведения о государственной регистрации: зарегистрировано решением Минского горисполкома от 20.09.2007 г. № 2159, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190870969.
**Период, за который проводился аудит:** за 2024 год.
**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях:** Бухгалтерская отчетность достоверна. Нарушений не выявлено.
Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: 27/03/2025 ЕПФР.
**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета):** свод правил корпоративного поведения обществом применяется.
**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:** www.vi-lario.com

### Оперативная информация о выплате дивидендов по акциям

Открытое акционерное общество «Стройдетали».
Месторасположение:
Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134.
Общим собранием акционеров общества от 27.03.2025 г.
(Протокол № 48) принято решение:
в связи с отсутствием прибыли дивиденды за 2024 г.
не выплачивать.

Директор А. В. Хвиневич
Главный бухгалтер Т. М. Гринь

УНП 600246748

# «М.@RT КАНТАКТ» РАЗДАЎ «ЗАЛАТЫЯ МАСКІ»

## Чым запомніцца XVIII Міжнародны маладзёжны тэатральны форум



Тэатральны тыдзень праляцеў як адно імгненне. Нехта з удзельнікаў заўважыў, што сёлета фестываль стаў паўналетнім. Юнацкая дзёрзкасць і шалёны рытм яму сапраўды ўласцівы. А яшчэ — каханне. Як адзначыла старшыня экспертнага савета фестывалю, доктар мастацтвазнаўства, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Вераніка Ярмалінская, тэмай пошуку кахання сёлета былі прасякнуты ўсе спектаклі.



Нагадаем, іх было 24! Акрамя беларускіх тэатраў, прыехалі расійскія і адзін азербайджанскі. Расійская геаграфія была прадстаўлена 14 рэгіёнамі. Традыцыйна — Масква і Санкт-Пецярбург, упершыню фестываль наведалі тэатры з Орска, Ульянаўска, Разані, Волагды, Луганска, Сергеева Пасада. З 20 да 27 сакавіка штодня на вялікай і малой сцэнах Магілёўскага абласнога драмтэатра, а таксама пляцоўках абласнога тэатра лялек і канцэртнай залы «Магілёў» ішлі па 3-4 спектаклі. У Сусветны дзень тэатра былі адзначаны найлепшыя з іх. Па меркаванні экспертнага савета, найлепшай стала эксперыментальная сцэна пад кіраўніцтвам Анатоля Праудзіна «Палата № 6» Санкт-Пецярбургскага тэатра-фестывалю «Балтыйскі дом». Маладзёжнае журы аддало перавагу Ульянаўскаму маладзёжнаму тэатру імя Б. У. Аляксандрава з іх спектаклем «Дуброўскі». Ну а прыз сімпатый гледачоў пад бурныя апладысменты быў уручаны Арлоўскаму дзяржаўнаму тэатру для дзяцей і моладзі «Свабодная прастора» за іх гарачы іспанскі мюзікл «Кармэн. Гісторыя Хасэ» — пастаноўка выклікала буру захаплення ў магілёўчан.



**Тэатральная заслона апушчана. У гледачоў засталося шмат уражанняў, у тэатральных калектываў з'явілася шмат новых тэм для разважанняў. Форум свае функцыі выканаў: даў не толькі відовішча, але і пажытак для розуму.**



Тэатральная заслона апушчана. У гледачоў засталося шмат уражанняў, у тэатральных калектываў з'явілася шмат новых тэм для разважанняў. Форум свае функцыі выканаў: даў не толькі відовішча, але і пажытак для розуму.

— Мне падабаецца гэты форум, лічу яго падзеяй і для Магілёва, і ў цэлым для Беларусі, — прызнаўся **рэжысёр-пастаноўшчык Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы імя Ленінскага камсамола Беларусі Дзяніс ФЁДАРАЎ.** — Шмат цікавых калектываў, славутыя рэжысёры, вельмі насычаная праграма — сапраўднае свята тэатра.

**Старшыня экспертнага журы Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ** падкрэслівае ўнікальнасць маладзёжнага тэатральнага форуму ў Магілёве.

— Кожны фестываль мае вялікае значэнне для нашай тэатральнай культуры, — кажа яна. — Іх у нас можна па пальцах пералічыць. У той жа Маскве іх болей чым 200, а па Расіі — наогул звыш 700. Таму магілёўскі фестываль значны, асабліва тым, што маладзёжны. Ён прасоўвае наша маладое пакаленне, маладую рэжысуру, маладых акцёраў.

**Тэатральны крытык Лізавета БАРАВІКОВА,** якая ў складзе маладзёжнага журы ацэньвае спектаклі форуму другі год, адзначыла захапляльную атмасферу М.@rt кантакта.

— Цудоўныя ўражанні ад фестывальнай праграмы, знаёмства з новымі калектывамі, ад сустрэч з ужо даўно знаёмымі тэатрамі, — падзялілася яна. — Некаторыя спектаклі я бачыла некалькі разоў, але заўсёды знаходзіла нешта новае. У нас выдатная каманда маладых крытыкаў. Міша Аўсееў і Надзея Хрысцюшына — студэнты 3-га курса тэатразнаўчага факультэта Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва. Мы шмат дзе ездзім, удзяляючы ў абмеркаваннях спектакляў нароўні са старэйшымі калегамі. Гэта добрая практыка. Мы можам дзесьці не пагадзіцца, з кімсьці паспрачацца, выказаць сваё меркаванне. А Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «М.@rt кантакт» — гэта вельмі значная падзея, каб сустрэцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара і БелТА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.**
**Продавец: ОАО «Труд», г. Гомель, ул. Советская, д. 39.**
**Торги состоятся 30 апреля 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условие продажи:** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается) | | |
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-246855**, площадью **962,4 кв. м,** назначение – складское помещение, наименование – **складское помещение.** Составные части и принадлежности: часть основного строения, пять пристроек, тамбур, крыльца. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/1. **Изолированное помещение с инв. № 350/D-246852**, площадью **330,5 кв. м,** назначение – производственное помещение, наименование – **производственное помещение.** Составные части и принадлежности: часть основного строения, две пристройки, тамбур. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/2. **Капитальное строение с инв. № 350/С-181548**, площадью **521,0 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально –технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад (ангар).** Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б. **Капитальное строение с инв. № 350/С-161164**, площадью **26,0 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное.** Составные части и принадлежности: холодная пристройка, крыльцо, крыльцо. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006000452,** общей площадью **1,3847 га. Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2. **Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации производственных зданий. **Капитальное строение с инв. № 350/С-159790**, площадью **0,0 кв. м**, протяженность – **213,6 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть.** Составные части и принадлежности: трубопровод тепловой сети от ТК-23-03 до здания, компенсатор, канал, лоток, опора, ТК (без номера), задвижки. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2 участок тепловой сети от ТК23-3 до здания. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006004899 (присвоен предварительно). Капитальное строение с инв. № 350/С-159791**, площадью **0,0 кв. м,** протяженность – **89,4 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть.** Составные части и принадлежности: трубопровод напорный от ВК-1 до здания, колодцы ВК-2, ВК-3,ВК-4. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2 участок водопроводной сети от ВК-1 до здания. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006004900 (присвоен предварительно). Капитальное строение с инв. № 350/С-159789**, площадью **0,0 кв. м**, протяженность – **149,2 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **канализационная сеть.** Составные части и принадлежности: трубопровод безнапорный от КК-1 до КК-9, колодцы КК-1, КК-2, КК-3, КК-4, КК-5, КК-6, КК-7, КК-8. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2, участок канализационной сети от КК-1 до КК-9. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006004898 (присвоен предварительно). В состав лота входят:** ворота металлические (инв. № 12) 8,60 м, дорога асфальтированная (инв. № 029) 101 кв. м, забор деревянный с воротами (запасной вход) (инв. № 08) 157 кв. м, забор с воротами (инв. № 026), 132 м, навес (инв. № 09), яблоня/30 (инв. № 9026), яблоня /35 (инв. № 9022), яблоня /35 (инв. № 9023), яблоня /38 (инв. № 9024), яблоня /41 (инв. № 9020), яблоня /44 (инв. № 9021), яблоня /44 (инв. №9025). **Информация о земельном участке (асфальтобетонная дорога):** кадастровый номер **340100000006005164,** общей площадью **0,0101 га. Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2. **Целевое назначение земельного участка:** для организации поезда общего пользования | **918 750,00** | 45 937,50 |

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. 8 (044) 551-22-67 Пастарнаков Н. В., заключение договора купли-продажи – +375 (29) 679-14-54 Пиневич И. П.

**Шаг аукционных торгов – 5 % (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Труд»):** Р/с BY11BLBB30120400062954001001, Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400062954, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №... (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 марта 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28, в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 28 апреля 2025 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить **вознаграждение в размере 2 % от цены продажи лота** по организации и проведении торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента его подписания.** Проводится аукцион в соответствии с Положением закрытого акционерного общества «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17; 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** На гэтым тыдні можаце выдатна адчуваць сябе дома. Знаходжанне ў сям'і, хатнія клопаты стануць вашым прыярытэтам. Будзеце з задавальненнем займацца гэтымі справамі. Для вас будзе важна правільна распарадзіцца наяўнымі фінансавымі рэсурсамі, і вы выдатна справіцеся з гэтай задачай.



**ЦЯЛЕЦ.** Гэты тыдзень можа прайсці вельмі неадназначна і разнапланава. Перш за ўсё, вас могуць чакаць прыемныя кантакты, знаёмства з новымі цікавымі людзьмі, займальныя паездкі. Таксама гэта добры час для прымірэння з тымі, з кім у вас апошнім часам былі нацягнутыя адносіны. Спіс кантактаў вашага тэлефона прыкметна пашырыцца, папоўніцца новымі цікавымі і карыснымі знаёмствамі.



**БЛІЗНЯТЫ.** Практычнасці і дзелавой хватцы Блізнят на гэтым тыдні могуць пазайздросціць многія. Увесь тыдзень у цэлым можа складвацца спрыяльна для папаўнення бюджэту за кошт дадатковых крыніц. Удалы час для адпачынку ў камфортнай адасобленай атмасферы. Накіруйце свае намаганні на вырашэнне прафесійных пытанняў, на кар'еру і фінансы.



**РАК.** На гэтым тыдні ўдалы час для асобаснага развіцця. Добра пачаць наведваць фітнес, займацца ў трэнажорнай зале. Так вы зможаце хутка ўмацаваць свой фізічны стан. Гэта выдатны час для стратэгічнага планавання, распрацоўкі плана на месяцы і гады наперад. Дзякуючы глыбокай ўзважанай аб'ектыўнай ацэнцы сітуацыі і сваіх магчымасцяў вы здольны скласці рэалістычныя планы.



**ЛЬВЫ.** На гэтым тыдні Львы змогуць дамагчыся пастаўленых мэт. Магчыма, вы пачняце праглядаць дэтэктыўныя фільмы або зацікавіцеся чытаннем дэтэктыўнай літаратуры. Вы зможаце прыкмячаць ледзь прыкметныя нюансы ў паводзінах іншых людзей і лепш разумець схаваныя псіхалагічныя прычыны. Імкненне весці адасоблены лад жыцця выдатна падыходзяць тым, хто сур'ёзна займаецца духоўнымі практыкамі.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні вам можа спадарожнічаць поспех у многіх пытаннях. Гэта выдатны час для разнапланавага баўлення часу з сябрамі. Многія вашы планы і мары пачнуць выконвацца, прычым часам гэта будзе адбывацца само сабой, без вашага актыўнага ўдзелу. Добра наведваць забаўляльныя мерапрыемствы. Удалы час для трэніровак і ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах.



**ШАЛІ.** Гэты тыдзень можа складвацца своеасабліва. З аднаго боку, у вас ёсць выдатныя шанцы для кар'ернага ўзлёту і поспеху на публіцы. З іншага боку, узмацняецца ваша патрэба пабыць у адзіноце, у атмасферы ўтульнай адзіноты, дзе вы маглі б спакойна засяродзіцца на любімай справе. Калі ў вас маюцца шкодныя звычкі, то можна паспяхова змагацца з імі.



**СКАРПІЁН.** Выдатны час для пазітыўных перамен у асабістым жыцці. Гэтымі днямі ў вас ёсць выдатны шанц дамагчыся кардынальнага паляпшэння адносін. Узрастае цікавасць да іншых культур, традыцый, у тым ліку можа ўзмацніцца жаданне наведаць культавыя збудаванні, храмы, манастыры. У вас можа з'явіцца шмат цікавых ідэй, якія можаце паспрабаваць увасобіць у жыццё.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні можа быць шмат клопатаў у сямейным жыцці і на рабоце. Магчыма, вам прапануюць новую цікавую працу. Таксама гэта спрыяльны час для вырашэння стратэгічных пытанняў у сям'і, размеркаванні спадчыны.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні можа складвацца выключны час для ўмацавання партнёрскіх адносін. Гэта датычыцца як дзелавога партнёрства, так і шлюбнага саюза. Каб урэгуляваць спрэчныя пытанні, неабходна разважаць і абмяркоўваць іх. Выкарыстоўвайце панядзелак і аўторак для прымірэння ў шлюбных адносінах. Удалы час для вучобы, здачы экзаменаў, публічных выступленняў.



**ВАДАЛІЎ.** Дзелавыя якасці на гэтым тыдні — на высокім узроўні. Вы можаце быць здольныя паспяхова вырашаць практычныя пытанні, чаго нельга сказаць пра асабістае жыццё. Таксама неабходна больш часу прысвячаць сваёму стану здароўя. Удалыя дні для пачатку наведвання фітнес-клуба.



**РЫБЫ.** На гэтым тыдні можаце паспяхова рэалізаваць сябе праз творчую актыўнасць. Узмацняецца цяга да ўсяго новага, незвычайнага, што здольна здзіўляць і радаваць. У гэтым сэнсе новая любоўная сувязь можа прыўнесці ў ваша жыццё новыя яркія ўражанні. Добра запланаваць на гэты тыдзень наведванне нейкага святочнага забаўляльнага мерапрыемства.

## АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

**Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.**

### ЧАГО НЕ ЗРОБІШ ДЛЯ ФЕДЗІ?!

**Гэта здарылася позняй вясной гадоў восем таму. Сужэнцы Генадзь і Марына не мелі клопату, як той казаў, — з'ездзілі на базар, купілі парсючка. А ўжо ж невялічкага, рабенькага, з доўгім лычыкам... Ну хоць карціну з яго малюй! Ніводнаму з папярэднікаў гаспадары мянушак не прыдумлялі, а вось гэтага Марына Федзем назвала.**

У катуху саломкі яму паслала, ежу штодня малачком бяліла (балазе кароўка свая)... Зажыў гадаванец! Але ж неяк пайшла гаспадыня шАтацца (так у нас кажуць пра дагляд гаспадаркі) і заўважыла, што дзверцы ў катушку ледзь трымаюцца... Папрасіла гаспадара паправіць. Таму, беднаму, часу не было (памагаў суседу гараж будаваць) — дзверцы адлажыў на заўтра... А назаўтра ўжо і патрэбы не было, бо... не было Федзі. Знік гадаванец! Шукаючы, Гена з Марынай аббегалі ўсю вёску, пыталіся, ці бачыў хто. Не!.. Парсючок як скрозь зямлю праваліўся!



Некалькі дзён у гаспадароў яшчэ цеплілася надзея, што знойдзецца, але ж потым прапала і яна.

...Тым часам лета настала. Па вёсцы сталі чуткі папаўзлі пра дзіва дзіўнае: адной кабеце, калі з ягад ішла, дарогу перабег невялікі дзічок (праўда, чамусьці рабенькі?), другі чалавек — у лесе парася сустрэў.

Трэцім быў паляўнічы.

Машыну ён пакінуў на ўзлеску, сам ішоў па сцежцы паміж лесам і кукурузным полем, калі сабака раптам сарваўся з месца, кінуўся ў гушчар і стаў так залівіста брахаць... «З чаго б?» — падумаў паляўнічы, скіраваўшы на голас, і ўбачыў кабанчыка, якога сабака загнаў пад выварацень у ямку, з якой, што называецца, ні ўзад ні ўперад... Факт, што паляўнічаму заставалася хіба злаўчыцца і злавіць бедака, потым занесці ў багажнік аўтамабіля, прывезці дамоў і, зразумела ж, пахваліцца трафеем.

...Чуткі пра яго хутка абляцелі вёску і ваколіцы, дайшлі да Марыны. «Дык гэта ж мой Федзя!» — па прыкметах здагадалася яна, прыхапіла барыш і разам з мужам паехалі да паляўнічага. Расказалі яму пра сваю ўжо досыць даўнюю страту, апісалі і лычык, і пямеры чорных плям на спінцы... Сумненняў не заставалася: гэта Федзя.

Убачыўшы яго, Марына з Генам вельмі здзівіліся: ён так падрос! Раней, гадуючы парасят, яны столькі клопатаў мелі: то ядуць, то нешта не ядуць, то пакварэюць... Гэтае самапасам жыло! Ну хіба ж не цуд!

Усю дарогу дамоў Федзя ехаў у легкавушцы, можна сказаць, на каленях у гаспадыні. Дома яна зварыла бульбачкі, стаўкла, заліла сырадоем... Не есць кабанчык! Запарыла яму камбікорм — таксама лычык свой верне!

Успомнілі тады, што жыў парсючок на падножным корме, побач з кукурузным полем. Прыйшлося (чаго не зробіш для Федзі?!) нейкі час пахадзіць па катахі.

**Нэлі Тумаш,**
*Смаргонскі раён.*

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 759 мм рт.сл. | +3..+5°C | +11..+12°C |
| ВІЦЕБСК | 761 мм рт.сл. | +2..+4°C | +11..+12°C |
| МАГІЛЁЎ | 761 мм рт.сл. | +3..+5°C | +10..+11°C |
| ГОМЕЛЬ | 760 мм рт.сл. | +3..+5°C | +11..+12°C |
| ГРОДНА | 762 мм рт.сл. | +3..+4°C | +11..+13°C |
| БРЭСТ | 758 мм рт.сл. | +4..+6°C | +13..+14°C |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +12..+14°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +13..+15°C

### Месяц

*Маладзік 29.03—04.04. Месяц у сузор'і Авена.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## 29 САКАВІКА — Даты. Падзеі. Людзі



У краіне

**1880** год — нарадзіўся Яўген Вітольдавіч Корчыц, вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцыны, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Скончыў Пецярбургскі, а затым і Маскоўскі ўніверсітэты. Працаваў земскім урачом. У гады Першай сусветнай і грамадзянскай войн — хірург ваенных шпіталяў. З 1926 года выкладаў на медыцынскім факультэце БДУ, пасля быў загадчыкам кафедры шпітальнай хірургіі Мінскага медыцынскага інстытута. Аўтар звыш 100 навуковых прац, у т. л. 12 манаграфій і падручнікаў.

**1900** год — нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін, беларускі кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі і СССР. Адзін з заснавальнікаў беларускага мастацкага кінематографа, у якім працаваў з 1925 года. Асноўнае месца ў творчасці займалі фільмы гісторыкарэвалюцыйнай тэматыкі з характэрнай рамантычнай прыўзнятасцю, эпічнай шырынёй. Як рэжысёр дэбютаваў фільмам «У агні народжаная». Пастаноўшчык першага гукавога фільма ў беларускім ігравым кіно «Першы ўзвод». Паставіў фільмы «Залатыя агні», «Пяюць жаваранкі», «Канстанцін Заслонаў» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і Дзяржаўнай прэміі СССР.



У свеце

**1561** год — нарадзіўся Санторыа (або Санкторыус), італьянскі ўрач, анатам, фізіёлаг, які першым вынайшаў і выкарыстоўваў тэрмометр і вымяральнік пульса.

**1886** год — атрымаўшы перамогу ў матчы з Ёганам Цукертортам, Вільгельм Стэйніц стаў першым афіцыйным чэмпіёнам свету па шахматах.

**1912** год — даследчык Антарктыкі Роберт Скот зрабіў свой апошні запіс у дзённіку, не дайшоўшы ўсяго некалькі кіламетраў да сваёй базавай станцыі.

**1973** год — завяршыўся вывад амерыканскіх войск з Паўднёвага В'етнама.

**1936** год — нарадзіўся Станіслаў Гаварухін, савецкі і расійскі кінарэжысёр, акцёр.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 291. Індэкс 63850. Зак. № 651. Нумар падпісаны ў 19.30 28 сакавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12